

ЯК У БЕЛАРУСІ ЗМАГАЮЦЦА З НАРКАТРАФІКАМ? 5

БДУ І ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СУБОТА № 195 (29564)

## КОРАТКА

• **У Магілёўскай вобласці стартаваў фотаконкурс «Першае слова — мама».**

• «Белавія» падаўжае прыпыненне рэйсаў у шэраг краін да 14 снежня.

• **Ансамбль флейтыстаў «Сірынкс» адзначыць 40-гадовы юбілей на сцэне Белдзяржфілармоніі.**

• Рэстаўратары «Лініі Сталіна» прыступілі да стварэння рэплікі танка Т-50.

• **Падчас аперацыі «Арсенал» канфіскаваны аўтамат, выкрадзены амаль 30 гадоў таму.**

• У Беларусі пачынае вяшчанне расійскі тэлеканал «Звезда HD».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Прыёмы грамадзян — гэта канстытуцыйны абавязак прадстаўнікоў улады любога ўзроўню, у тым ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Калі вырашаны многія дробныя бытавыя пытанні, людзі пачынаюць задумвацца пра больш глабальныя праблемы. На месцах відаць, што хвалюе жыхароў. Якое б пытанне ні ўздымалі заяўнікі, мы вырашаем іх ва ўстаноўленыя тэрміны або даём вычарпальнае тлумачэнне, абапіраючыся на заканадаўчую базу. І самае галоўнае — пры вырашэнні любой праблемы ў цэнтры ўвагі заўсёды стаяць інтарэсы чалавека».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «БЫЦЬ ПА-ДОБРАМУ АГРЭСІЎНЫМІ, ПРЫМЯНЯЦЬ САМЫЯ СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ І БІЗНЕС-ІДЭІ»

## Пра што гаварыў Прэзідэнт на сходзе спажыўкааператараў



Фота БелТА.

**Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў. Мерапрыемства праходзіла ў Палацы Рэспублікі. Яго ўдзельнікамі сталі каля 450 прадстаўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у сістэму Белкаапсаюза. У першай частцы сходу, да прыбыцця кіраўніка дзяржавы, быў абраны старшыня праўлення. Ім стаў першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Мацкевіч.**

**З удзелам Прэзідэнта прадстаўнікі Белкаапсаюза абмеркавалі стан і перспектывы спажывецкай кааперацыі і стратэгіі яе развіцця ў рэгіёнах краіны.**

### Не толькі гандаль

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што гістарычна на ўсёй постсавецкай прасторы толькі ў Беларусі спажыўкааперацыя захавалася і ўдзельнічае ў фарміраванні сацыяльнай інфраструктуры краіны, займаючы ў ёй унікальнае месца. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з гандлю, па сутнасці, пачалася гісторыя беларускай кааперацыі, калі яна стала размяркоўваць прадукты па картках згодна з устаноўленымі нормамі і цэнамі. «Ды і цяпер гандаль — галоўнае ў вашай дзейнасці. Гэта сёння асноўная галіна Белкаапсаюза, якая займае амаль 20 % усяго тавараабароту ў вёсцы. Менавіта вы абслугоўваеце маланаселеныя вёскі, дзе менш за 10 жыхароў. Такіх пунктаў на карце Беларусі каля 5 тысяч. І для старых, якія там жывуць, вашы крамы, аўтакрамы, нарыхтоўчыя пункты — гэта ўжо цэнтр грамадска-палітычнага жыцця. А вы — галоўныя ідэолагі і прапагандысты», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Таму, даручыў Аляксандр Лукашэнка, тэндэнцыя на змяншэнне колькасці гандлёвых аб'ектаў, асабліва ў сельскай мясцовасці, павінна быць старанна прааналізавана. Паводле наяўных звестак, у 2020 годзе ў параўнанні з 2019-м колькасць крам скарацілася амаль на 300 адзінак, або на 5 %, а рухомых сродкаў развознага і разноснага гандлю — на 2 %.

«Жыццё не стаіць на месцы. Прыходзяць новыя тэхналогіі. У нас няпростая сітуацыя з бюджэтам, калі трэба лічыць і эканоміць кожную капейку. Гэта ў любой краіне так. ***Таму галоўнае — усе паслугі павінны быць даступныя сельскаму жыхару ў тых жа аб'ёмах, што і ў горадзе, і іх якасць павінна пастаянна расці»,*** — заўважыў Прэзідэнт. «Калі вы не будзеце трымаць узровень сэрвісу, займацца рэканструкцыяй і абнаўленнем крам і кафэ, яны не выжывуць. Сучасны ўзровень гандлю вельмі высокі. Беларусы за апошнія гады прывыклі, па сутнасці, да еўрапейскай якасці паслуг. І калі вы хочаце падтрымліваць належны ўзровень і ў малых населеных пунктах, аграгарадках, то асартымент і абслугоўванне там не павінны адрознівацца ад сталічных», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, заклікаўшы ў гэтым плане слухаць водгукі простых людзей, якія адзначаюць пэўную закасцянеласць спажыўкааперацыі.

СТАР. 2

Кантакт

# З ПОШТЫ — З ДОБРЫМ НАСТРОЕМ!





**XXI стагоддзе нездарма называюць стагоддзем інфармацыйных тэхналогій. Шматлікія смартфоны і іншыя гаджэты, пры дапамозе якіх мы маем зносіны, сталі неад'емнай часткай сучаснага жыцця. Але і да гэтага часу мы накіроўваем адзін аднаму паштоўкі, пасылкі, звычайныя лісты, атрымліваем друкаваныя выданні. І дапамагае ў гэтым паштовая служба, свята якой адзначаецца 9 кастрычніка. Напярэдадні Сусветнага дня пошты на пытанні нашага карэспандэнта адказала генеральны дырэктар апаратара беларускай нацыянальнай паштовай сеткі РУП «Белпошта» Святлана ЮРКЕВІЧ.**

***— Святлана Віктараўна! Як даўно вы ўзначалілі прадпрыемства? Дзе працавалі да назначэння на цяперашнюю пасаду?***

— Шчыра прызнацца, вопыт работы ў сістэме менавіта паштовай сувязі ў мяне даволі невялікі. 17 верасня споўнілася два гады, як я прыйшла на прадпрыемства. Але ўвогуле ў галіне сувязі я працую з 1999-га. На РУП «Белпошта» прыйшла з РУП «Белтэлекам». Па асноўнай спецыяльнасці я эканаміст, займалася пытаннямі эканомікі, кіравання, фінансавай дзейнасці, кадравай работы, аховы працы і іншым.

СТАР. 8

На слыху

# ЗАДЗЕЙНІЧАНЫ ЎСЕ РЭСУРСЫ

## Як працуюць паліклінікі ва ўмовах росту захваральнасці на ВРВІ і COVID-19

**З верасня ў Беларусі назіраецца пад'ём захваральнасці на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, у тым ліку на COVID-19. Медыкі звязваюць гэта з пачаткам вучэбнага года, які супаў з пагаршэннем надвор'я і істотным пахаладаннем. Сапраўды, сярод хворых на ВРВІ шмат дзяцей і падлеткаў.**

Паводле інфармацыі Мінскага гарадскога цэнтра здароўя, яны складаюць каля 70 %, а захваральнасць на рэспіраторныя інфекцыі ў сталіцы знаходзіцца на звычайным для гэтага перыяду ўзроўні. Праўда, да сезонных вострых рэспіраторных вірусных інфекцый цяпер дадаецца і каранавірусная інфекцыя. Апошнія тыдні, паводле даных Міністэрства аховы здароўя, штодзень у краіне рэгіструецца амаль дзве тысячы новых выпадкаў COVID-19. Пры гэтым колькасць тых, хто зрабіў прышчэпкі, расце не так імкліва. Пакуль больш за 2 млн 342 тысячы беларусаў атрымалі першую дозу вакцыны, з іх больш за 1 млн 702 тысячы прайшлі поўны курс вакцынацыі.

Як працуюць паліклінікі ва ўмовах росту захваральнасці? Як трапіць да ўрача-спецыяліста, калі ваша праблема не звязана з ВРВІ? Ці шмат ахвотных вакцынавацца і ці ёсць выбар вакцын? Як цяпер арганізавана работа амбулаторнага звяна, мы паглядзелі на прыкладзе 11-й гарадской паліклінікі Мінска і паразмаўлялі з яе **галоўным урачом Ірынай БОЛДЫРАВАЙ**, якую дачакаліся пасля прыёму пацыентаў.



СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

# «БЫЦЬ ПА-ДОБРАМУ АГРЭСІЎНЫМІ, ПРЫМЯНЯЦЬ САМЫЯ СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ І БІЗНЕС-ІДЭІ»

## Пытанне асартыменту і якасці абслугоўвання

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што паказчыкі развіцця гандлю і грамадскага харчавання Белкаапсаюза складваюцца ніжэйшыя за сярэднерэспубліканскі ўзровень. Пры гэтым перавага харчовых тавараў у структуры рознічнага тавараабароту таксама застаецца праблемай. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што раней даручаў павышаць долю нехарчовай прадукцыі, але даручэнне не выканана.

Ён таксама звярнуў увагу, што спажыўкааперацыя на 90 % гандлюе беларускімі таварамі. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка ўказаў на магчымасць аб'ядноўвацца з айчыннымі вытворцамі і праводзіць акцыі, распродажы: «Як на штогадовых сезонных кірмашах у верасні—кастрычніку. Гэтую традыцыю мы нядаўна адрадзілі, і насельніцтва яе выдатна ўспрыняло. Калі ў гэтым вам патрэбна будзе дапамога, мы падштурхнём вашых партнёраў».

Не менш востра стаіць задача павышэння якасці абслугоўвання. Індыкатарам праблемы служыць паступовая страта пазіцый на ўнутраным спажывецкім рынку. «У рознічным тавараабароце ваша ўдзельная вага за апошнія пяць гадоў (з 2016 да 2020 года) упала амаль у два разы (з 7 % да 3,9 %). Сёлета такая негатыўная тэндэнцыя захоўваецца», — адзначыў Прэзідэнт.

## Дайце беларусам дранікі

Прэзідэнт сарыентаваў арганізацыі спажыўкааперацыі на тое, каб у сваім развіцці яны ўлічвалі сучасныя тэндэнцыі попыту і прапановы, прасоўвалі тое, што ўжо даўно ўмеюць рабіць лепш за ўсіх.

«Увайдзіце ў любы рэстаран: там жа такія «навароты», што цяжка ўявіць, — гэта твор мастацтва. ***А людзі хочуць смажанку, звычайных дранікаў. Гэта значыць, надышоў новы перыяд у жыцці. Гэта заўсёды маятнік: туды хіснуўся, потым сюды. І вось гэты момант. І вы не павінны яго страціць»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што многія з замежных дыпламатаў ходзяць не ў крамы, а на рынак, каб купіць фермерскую прадукцыю. «Дык вы гэтым скарыстайцеся. І калі будзеце варушыцца, то за мной не заржавее. Я заўсёды змагу падставіць плячо», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама гарантаваў падтрымку, калі будзе жаданне развіваць невялікія вытворчасці ў любым пункце Беларусі і ў тым ліку ў Мінску.

Прэзідэнт заклікаў яшчэ раз падумаць і вызначыцца, як Белкаапсаюзу прасоўваць сваю прадукцыю, у тым ліку цэнтралізавана, праз стварэнне буйных гандлёвых пунктаў. Ён нагадаў, што раней арганізацыі дазволілі ствараць такія крамы ў Мінску. «І я часта, праязджаючы тут па цэнтральным праспекце, бачу гэтыя крамы. Але чаму вы далей не пайшлі?» — пазначыў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

## Трэба ісці ў інтэрнэт

Прэзідэнт сарыентаваў Белкаапсаюз на развіццё сегмента інтэрнэт-гандлю. «Я не параўноўваю вас з буйнымі сеткамі ў Мінску. Бо прывезці тавар адразу ў адзін гандлёвы аб'ект і зняць прыбытак нескладана. А вось даехаць да кожнай аддаленай вёсачкі не кожны зможа. Але і тут ёсць рашэнні. Паглядзіце, як за апошнія некалькі гадоў развіўся інтэрнэт — і электронны гандаль», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

За год, паводле Белстата, такім чынам прададзена тавараў на $1,1 млрд, і гэты сегмент рынку расце ў сярэднім па 20 % у год.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з тым, што пажылым людзям, магчыма, будзе складана карыстацца гэтымі паслугамі з дапамогай інтэрнэту. «Але ёсць дзеці, якія могуць заказаць чалавеку. І вы па гэтым заказе зможаце ажыццявіць пастаўку. Пачніце гэта не на шкоду сабе і паглядзіце. І для мяне будзе важна як для эканаміста, які прывык верыць канкрэтным фактам. Паглядзім, што атрымаецца ў выніку вашага гэтага эксперымента ў Белкаапсаюзе», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

«Паўсюль трэба варушыцца для таго, каб зарабіць капейку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Свежасць бывае толькі адна — першая

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў не дапускаць парушэнняў у рабоце сельскіх крам. «Абсалютна непрымальныя факты безадказнасці і халатнасці работнікаў. Нават з глыбінкі мне паступаюць адпаведныя скаргі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пра аналагічныя парушэнні дакладвае і Камітэт дзяржаўнага кантролю. Самыя масавыя з іх — гэта продаж тавараў з мінулымі тэрмінамі прыдатнасці, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Так, у адным з магазінаў Кіраўскага райпо была выяўлена рэалізацыя 12 найменняў харчовых тавараў з мінулымі да 26 сутак тэрмінамі прыдатнасці, а ў краме ў вёсцы Любоніч — пяці найменняў, тэрміны прыдатнасці якіх прайшлі паўгода таму назад.

***«Падвяргаць небяспецы здароўе людзей, карыстаючыся тым, што пайсці па пакупкі ім больш няма куды, — гэта, прабачце, злачынства!»*** — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён нагадаў, што кожны населены пункт, у якім няма стацыянарнай крамы, павінен абслугоўвацца аўтакрамай: «Мы ж дамаўляліся, іх павінна быць не менш за тысячу. З захаваннем усіх санітарных і іншых патрабаванняў. Асартымент як харчовых, так і нехарчовых тавараў павінен быць адпаведны».

У гэтым пытанні Аляксандр Лукашэнка таксама запатрабаваў выключыць негатыўныя факты, пра якія дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю.



Фота БелТА.

## Цэны — пад кантроль

Прэзідэнт таксама адзначыў, што неабгрунтаваны рост цэн, асабліва на сацыяльна значныя тавары, недапушчальны. ***«Галоўнае — цэны. Унутрыведамасны кантроль за імі будзе падмацоўвацца маніторынгам Камітэта дзяржаўнага кантролю і прафсаюзамі. У найбліжэйшы час мы гэты кірунак будзем узмацняць***, — сказаў Прэзідэнт. — Таму што аб'ектыўна — шалёны рост цэн, у свеце падаражэла харчаванне вельмі моцна... Усё падскочыла ў цане».

Многія, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, перш за ўсё ў гандлі, ды і вытворцы, пад шумок аб'ектыўнага працэсу росту цэн пачынаюць суб'ектыўна падладжвацца і яшчэ больш падымаць іх. «Мы павінны гэта бачыць і ў гэтым дзікім рынкавым вэрхале знайсці нейкі свой шлях, каб стрымаць цэны», — заявіў беларускі лідар.

«Таму мною даручана перш за ўсё прафсаюзам, Камітэту дзяржкантролю, адпаведным падраздзяленням урада і дэпутатам звярнуць сур'ёзную ўвагу, вывучаць цэны і прымаць канкрэтныя рашэнні. ***Трэба пераЖыць гэты момант і не даць магчымасці тым, хто прывык нажывацца на росце цэн, гэта зрабіць. У адваротным выпадку прыйдзем ужо да сапраўднай рэвалюцыі. Людзі гэтага не вытрымаюць. Таму мы ўдзяляем сёння сур'ёзную ўвагу кантролю за цэнаўтварэннем»***, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што нядаўна падпісаў адпаведны ўказ: «Неабгрунтаваны рост цэн, асабліва на сацыяльна значныя тавары, недапушчальны. У гэтым яго сутнасць. Гэта застаецца маім жорсткім патрабаваннем. Ні адзін чалавек не павінен пераплачваць за нечую безгаспадарчасць ці жаданне набіць кішэню».

## Трэба зняць белыя пальчаткі

Прэзідэнт сарыентаваў арганізацыі Белкаапсаюза на павышэнне эфектыўнасці сваёй працы. «Дапамагаць вам, калі ў людзей яблыкі гніюць, яны памідоры-агуркі часам у канаву выкідваюць, не ведаюць, куды тыя ж самыя клубніцы падзець, бо ніхто не бярэ... (такія факты былі ў прэсе летась). Я асабіста вашага старшыню Белкаапсаюза пасылаў у канкрэтныя пункты для таго, каб дапамагчы людзям. Прымусіць працаваць — задача кіраўнікоў, у тым ліку і мая, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Больш Белкаапсаюз па сваіх паказчыках не павінен плесціся ў хвасце. І ўрад з аблвыканкамамі спакойна на такое становішча спраў глядзець не павінны. Вы наогул адсунуліся ад гэтай праблемы, па вялікім рахунку. ***Зразумейце нарэшце, што ва ўмовах санкцый трэба біцца за любую магчымасць зарабіць. А тут проста золата пад нагамі валяецца. Толькі трэба зняць белыя пальчаткі і падняць яго»***.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адна з ключавых функцый спажыўкааперацыі, якую наўрад ці ў гэтым хтосьці зможа замяніць, — нарыхтоўчая дзейнасць. У 2020-м у насельніцтва была набыта прадукцыя на Br205 млн, у бягучым — ужо на Br230 млн.

«Вядома, я часта кажу, што гэта даходы нашых вяскоўцаў, пэўная занятасць на вёсцы. Аднак у першую чаргу гэта ваша выратаванне», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт прывёў прыклад, наколькі ў гэтым плане ў апошнія гады лепш працуюць прыватнікі, фермеры і нават рамеснікі і самазанятасць. ***«Тыя, хто разумнейшы, даўно зразумелі перспектывы гэтага рынку»***, — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што свет сёння ў добрым сэнсе слова «павернуты» на экалагічна чыстай, арганічнай прадукцыі. «Гэта выгадны бізнес. І яшчэ адна ваша фішка. Чаму не раскручваць дадзеную тэму, закупляючы ў насельніцтва самы лепшы тавар, у якім няма ні кансервантаў, ні заменнікаў, ні фарбавальнікаў, а ёсць толькі жывыя вітаміны?» — паставіў пытанне кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запатрабаваў спыніць прыкрывацца нарыхтоўчай дзейнасцю толькі як сацыяльнай функцыяй. «Ці не яна галоўная? Гэта перш за ўсё рэзерв для ўмацавання вашага фінансавага стану і нават экспартны патэнцыял. Пра гэта не трэба забываць», — падкрэсліў беларускі лідар.

## Па рабоце мяркуюць аб уладзе

Прэзідэнт прызнаў, што крытыка ў адрас Белкаапсаюза нярэдка аб'ектыўная. Напрыклад, як дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю, выяўлены факты адсутнасці элементарнай інфармацыі для грамадзян аб магчымасці вывазу сабранай прадукцыі з асабістага падворка, а асобныя прыёманарыхтоўчыя пункты і зусім часта зачыненыя па незразумелых прычынах. «У выніку пакрыўджаныя такімі адносінамі людзі пішуць скаргі ва ўсе інстанцыі. А тавар гніе і прападае», — адзначыў Прэзідэнт.

«Вы нарэшце павінны зразумець, што вы ў тым ліку аблічча ўлады там, на месцах. Па вашай працы сельскія жыхары даюць ацэнку і Прэзідэнту. ***Няўжо незразумела, што ў масавы сезон ягад, грыбоў, яблыкаў вашы пункты павінны быць даступныя круглыя суткі? Ва ўсіх ёсць мабільныя тэлефоны. І не так складана арганізаваць, каб вашых нарыхтоўшчыкаў людзі ведалі лепш, чым старшыняў раёнаў. Хай яны будуць пастаянна на сувязі і аказваюць нармальныя паслугі»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама даручыў наладзіць цеснае супрацоўніцтва з кожным фермерам, уладальнікам асабістай падсобнай гаспадаркі:

***«Закупкі ў насельніцтва застаюцца на жорсткім кантролі, і задача новага кіраўніцтва — эфектыўна арганізаваць гэты працэс»***, — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## Захаваць і перапрацаваць

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што пытанне забеспячэння захаванасці закладзеных бульбы, гародніны і садавіны таксама патрабуе ўвагі. Рэалізацыя закупленай раней прадукцыі не толькі насычае рынак, але і рэгулюе цэны ў міжсезонне.

У цэлым па краіне рэзервы ў перапрацоўцы велізарныя, звярнуў увагу Прэзідэнт. Па плодаагароднінных кансервах доля беларускага тавару на рынку — крыху большая за 50 %, па соках і марынаванай гародніне — 60 %, па дзіцячым харчаванні — 85 %. «І гэта вашы нішы Белкаапсаюза. Займайце іх. Мы будзем вас падтрымліваць. Ідзіце адваёўваць рынак. Навошта мы імпартуем стольк кетчупаў, салянак, фасолевых і грыбных кансерваў, кукурузы і гарошку? Мы ж усё гэта можам у Беларусі рабіць. Вы ж хваліцеся, што адраджаюцца народныя промыслы, маркі, ствараеце сучасныя гандлёвыя знакі? А дзе вынік? Ваша задача — выйсці да 2025 года на 90 % перапрацоўкі ва ўласнай сістэме закупак», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт упэўнены, што Белкаапсаюз можа канкурыраваць з гандлёвымі сеткамі ў рабоце з пастаўшчыкамі. «Для спажыўкааперацыі застаецца важнай задачай стварэнне адзінай сістэмы аптовых закупак. Менавіта ў гэтым звяне можа губляцца ад 5 % да 10 % дабаўленай вартасці. Вы ведаеце маё стаўленне да неабгрунтаваных пасярэднікаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама закрануў Прэзідэнт і тэмы звераферм Белкаапсаюза, на якія прыпадае больш за 90 %

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ад рэспубліканскай вытворчасці. «У далейшым праца павінна быць арганізавана так, каб гэтая сфера больш не прасіла бюджэтных грошай, а прыносіла стабільны даход. Да гэтага будзе асаблівая ўвага і кантроль», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### Не заваліць грашыма, а дапамагчы ў канкрэтнай справе

Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў эканамічны стан і зарплаты ў Белкаапсаюзе. Прэзідэнт адзначыў, што ў краіне эканоміка ў цэлым расце, паказчыкі ніядрэнныя і толькі ў Белкаапсаюзе за год самы вялікі рост колькасці стратных арганізацый — у 2,5 раза. «Па сутнасці, надзвычайнае становішча. Шкада, што ўрад і аблвыканкамы гэтага не бачаць. Прычыны на паверхні, пра іх ужо сёння сказана: галіна амаль не займаецца экспартам, дзе сёння асноўныя даходы, на затраты не глядзяць, працэнты шалёныя, тым не менш ніхто не змагаецца за зніжэнне — працім. Таму такі вынік. Ёсць і іншыя артыкулы шалёных выдаткаў і росту сабекошту», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што як вынік жаласнага стану фінансаў — няма чым хваліцца ў пытанні заработнай платы.

***<u>«Спажыўкааперацыя прадстаўлена ў кожным рэгіёне краіны. Пакуль аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, старшыні раёнаў не перастануць адмахвацца ад гэтых пытанняў, нічога не зрушыцца з месца»</u>***, — сказаў беларускі лідар, заўважыўшы, што спажыўкааперацыя просіць не такую ўжо і вялікую падтрымку, калі параўноўваць з той жа прамысловасцю. А значыць, ёй трэба дапамагаць, але і дарыць нічога не трэба, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. «Трэба развязаць гэтыя вузлы. Не грашыма завальваць іх, а дапамагчы ў канкрэтнай справе».

### Усе ў адной лодцы

Прэзідэнт адзначыў неабходнасць умацоўваць эканоміку краіны, каб выстаяць у геапалітычным супрацьстаянні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што эканоміцы сёння трэба ўдзяляць асаблівую ўвагу. «А ў эканоміцы сёння ў краіне выканальніцкая дысцыпліна. Вы мой характар ведаеце: за мной не заржавее. І паўнамоцтваў у мяне досыць, пакуль яшчэ новую Канстытуцыю не прынялі і пакуль я яшчэ Прэзідэнт. Таму трэба пачынаць варушыцца», — дадаў беларускі лідар.

Кіраўнік краіны ў час сходу пазначыў праблемныя пытанні ў дзейнасці спажывецкіх таварыстваў і магчымыя шляхі іх вырашэння. Свае даручэнні, заявіў Прэзідэнт, ён адрасуе не толькі новаму старшыні Белкаапсаюза. У роўнай ступені гэта, паводле яго слоў, датычыцца і ўрада, аблвыканкамаў, галіновых ведамстваў.

***<u>«Усе ў адной лодцы. І калі яна разгайдаецца і не дай бог перакуліцца, схваціца ні ў кога не атрымаецца. Або адкажа ўся вертыкаль улады. Па-іншаму быць не можа</u>***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***<u>Памятаеце, Белкаапсаюз быў створаны людзьмі і для людзей. Ваша сістэма мае найвелізарнейшы патэнцыял. Ніхто мяне ў адваротным не пераканае. Вы можаце канкураваць па ўсіх напрамках. Галоўнае — не сядзець склаўшы рукі, быць па-добраму агрэсіўнымі, прымяняць самыя сучасныя падыходы і бізнес-ідэі»</u>***.

Прэзідэнт лічыць, што для гэтага ў спажыўкааперацыі ёсць усе рэсурсы: матэрыяльная база, вопытныя кадры і падтрымка дзяржавы. «Агульны кантроль за работай спажыўкааперацыі па-ранейшаму застаецца за ўрадам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. У гэтай звязцы я вас не падзяляю. Па выніках 2021 года чакаю даклада ў першым квартале 2022-га пра першыя вынікі праведзенай работы», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле Прэс-службы Прэзідэнта.**

Дружба без межаў

# НАЙБУЙНЕЙШАЯ ПЕРАГАВОРНАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ НОВЫХ ПРАЕКТАЎ

## Так ахарактарызаваны форум гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Расіі

**Дзясятая юбілейная сустрэча гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Расіі адбылася ў пятніцу, 8 кастрычніка, у горадзе Жодзіна. Перад пачаткам пленарнага пасяджэння ўдзельнікі правялі мітынг, прысвечаны Году народнага адзінства, каля манумента А. Ф. Купрыянавай. Да помніка маці-патрыёткі ўсклалі кветкі. А затым стартаваў лёгкаатлетычны і аўтапрабег «Эстафета адзінства».**

Тэма сустрэчы — «Пабрацімства як важны патэнцыял умацавання Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і адзінства народаў». Форум сабраў больш за пяцьдзясят гарадоў і звыш ста чалавек, кіраўнікоў гарадскіх і раённых адміністрацый, прадстаўнікоў, грамадскіх арганізацый гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Расіі.

Прывітальны ліст удзельнікам сустрэчы накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «пабрацімскі рух уносіць неацэнны ўклад ва ўмацаванне гандлёва-эканамічных сувязяў паміж беларускімі і расійскімі прадпрыемствамі, садзейнічае рэалізацыі сумесных бізнес-праектаў і абмену вопытам». Беларускі лідар упэўнены, што паспяховае правядзенне гэтай сустрэчы будзе садзейнічаць эфектыўнаму пашырэнню кантактаў па лініі органаў улады, дзелавых, навуковых і творчых колаў, а таксама выпрацоўцы канкрэтных рашэнняў, накіраваных на паступальнае развіццё ўсяго комплексу адносін паміж гарадамі і рэгіёнамі нашых брацкіх краін.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марына ІЛЬІНА** адзначыла, што гэты знакавы праект з'яўляецца найбуйнейшай перагаворнай пляцоўкай нашых краін. Беларусь і Расія мэтанакіравана ідуць па шляху ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, і, несумненна, пашырэнне і ўзмацненне кантактаў паміж гарадамі-пабрацімамі забяспечаць узмацненне адзінства і збліжэння народаў.

Марына Ільіна перадала ўдзельнікам сустрэчы прывітальны адрас ад Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качанавай. Прысутным цікава было паслухаць і вдзапрывітанне лётчыка-касманаўта, Героя Расіі, ураджэнца Мінскай вобласці Алега Навіцкага з касмічнай арбіты. Вельмі добра, што сяброўскія адносіны аб'ядноўваюць не толькі людзей, але і гарады і краіны. Пабрацімскія сувязі з'яўляюцца важнымі ўмовамі развіцця любога горада, сказаў касманаўт.

**Старшыня праўлення беларускай грамадскай арганізацыі «Пародненыя гарады» Барыс БАТУРА** адзначыў, што няпроста было сустрэцца ў гэты складаны час, калі свет скаланае палітычная і эканамічная нестабільнасць, трывожнай застаецца і эпідэміялагічная сітуацыя. Нямала клопатаў і мясцовага значэння, якія патрабуюць штодзённай увагі. «Аднак мы сёння ў беларускім горадзе. І гэтая сустрэча — сімвал дружбы і прыярытэтаў», — лічыць Барыс Батура.

Пра вытворчы, сацыяльны, навукова-практычны, эканамічны і культурны патэнцыялы Жодзіна расказаў прысутным **старшыня гарвыканкама Дзмітрый ЗАБЛОЦКІ**. Удзельнікі сустрэчы пазнаёміліся з работай найбуйнейшых прадпрыемстваў, у тым ліку ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-Холдынг». А **старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ і старшыня Савета дэпутатаў муніцыпальнага ўтварэння гарадской акругі Ухта Арыстарх АНІСІМАЎ** падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве паміж Гроднам і Ухтой (Расія).

Далей удзельнікі сустрэчы працавалі па секцыях. Яны абмеркавалі шырокае кола пытанняў. Такія, як умацаванне сяброўскіх сувязяў, актывізацыя гандлёва-эканамічнага, гуманітарнага супрацоўніцтва паміж гарадамі і рэгіёнамі краін. Вялікая ўвага была ўдзелена вопыту партнёрства, рэалізацыі сумесных праектаў у вытворчай, сацыяльнай, культурнай сферах, удасканаленню работы з моладдзю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Законапраект

# ЗРАЎНЯЦЬ УМОВЫ

## праз падатак на нерухомасць

**Першы авансавы плацеж за нерухомасць мы павінны будзем унесці ўжо ў лістападзе наступнага года. Разам з тым удакладняем, хто з уласнікаў кватэр усё роўна не будзе плаціць новы падатак.**

Нагадаем, што ў нашай краіне з 2022 года прапануецца адмяніць падатковую льготу для ўладальнікаў кватэр. Гэта прадугледжана праектам змяненняў, якія ўносяцца ў Падатковы кодэкс. Як паведаміў нашаму выданню **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО,** «мэта гэтага новаўвядзення — зраўняць умовы падаткаабкладання гарадскіх грамадзян (якія валодаюць памяшканнямі ў шматкватэрных дамах) з жыхарамі сельскай мясцовасці, якія з'яўляюцца ўладальнікамі індывідуальнага жылля. Акрамя таго, гэтым рашэннем значна павышаецца рэсурсная база мясцовых бюджэтаў».

Мяркуецца, што ў якасці падатковай базы возьмуць разліковы кошт кватэр, вызначаны Падатковым кодэксам. Да яго прымяніцца стандартная стаўка ў памеры 0,1 %. Разліковы кошт будзе дыферэнцыраваны па гарадах, а таксама па тыпах кватэр.

У прэс-службе Мінфіна таксама ўдакладнілі, хто ў новым годзе становіцца плацельшчыкам падатку на нерухомасць. **Гэта фізічныя асобы, якія маюць ва ўласнасці або прынятыя па спадчыне жылыя памяшканні ў шматкватэрным або блакіраваным жылым доме** (долі ў праве ўласнасці або ў спадчыне на азначаную маёмасць). Але ў той жа час існуе льгота па падатку на нерухомасць. Яна закране дастаткова аб'ёмную частку насельніцтва.

Па-першае, гэтая льгота захоўваецца для асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (або якія маюць права на пенсію па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту). Падатак не будуць плаціць асобы, прызнаныя недзеяздольнымі, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, а таксама інваліды І і ІІ групы. Падатковая льгота застаецца ў непаўналетніх дзяцей, членаў шматдзетных сем'яў, ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і іншых асоб, якія маюць права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з законам «Аб ветэранах».

Акрамя таго, сума, якая падлягае да выплаты падатку на нерухомасць у дачыненні да жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах, вызначаецца зыходзячы з разліковага кошту 1 квадратнага метра тыпавога капітальнага будынка на 1 студзеня бягучага года, агульнай плошчы жылога памяшкання і стаўкі падатку ў памеры 0,1 %.

Так, напрыклад, пры рэалізацыі названых падыходаў сярэдні падатак на нерухомасць за стандартную кватэру плошчай 60 «квадратаў» у год складзе ад 27 рублёў у раённых цэнтрах да 50 рублёў у Мінску, што супастаўна з падатковай нагрузкай на ўладальнікаў жылых дамоў у сельскай мясцовасці.

«Пры гэтым для спрашчэння адміністравання фізічныя асобы будуць ажыццяўляць аплату падатку на нерухомасць за 2022 год у наступным парадку. Не пазней за 15 лістапада 2022 года — авансавы плацеж па падатку на нерухомасць на падставе паведамлення падатковага органа, якое ўручаецца плацельшчыку не пазней за 1 верасня 2022 года. Авансавы плацеж аплачваецца ў памеры 50 % вылічаных за 2022 год сум падатку. Не пазней за 15 лістапада 2023 года будзе даплата падатку на нерухомасць на падставе паведамлення падатковага органа, якое ўручаецца не пазней за 1 верасня 2023 года», — растлумачылі ў Мінфіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Праўленне і калектыў ААТ «Белгазпрамбанк» выказваюць глыбокія спачуванні выконваючай абавязкі старшыні праўлення Ірыне Алегаўне Патапавай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МЗС Францыі: аб'яўленне Польшчай прыярытэту сваёй канстытуцыі — атака на ЕС

**Абвяшчэнне Канстытуцыйным судом Польшчы прыярытэту яе канстытуцыі над нормамі заканадаўства Еўрапейскага саюза з'яўляецца атакай на ЕС. Пра гэта 8 кастрычніка заявіў дзяржаўны сакратар пры французскім МЗС Клеман Бон.**

«Абвяшчэнне Канстытуцыйным судом Польшчы вяршэнства яе права над еўрапейскімі нормамі з'яўляецца атакай на Еўрасаюз. Польскія ўлады не паважаюць каштоўнасці і фундаментальныя правілы саюза», — сказаў ён.

Пры гэтым у МЗС Францыі ўдакладнілі, што ў выпадку, калі Польшча не будзе выконваць правілы, яна можа пазбавіцца фінансавай падтрымкі супольнасці.

### Лаўрэат Нобелеўскай прэміі: Еўропа павінна сустракаць мігрантаў спачуваннем

**Еўропа павінна сустракаць мігрантаў спачуваннем, а не калючым дротам. Пра гэта ў інтэрв'ю Reuters заявіў пісьменнік Абдулразак Гурнэ, які быў удастоены Нобелеўскай прэміі 2021 года па літаратуры.**

Паводле яго слоў, Еўропе варта пераасэнсаваць свой падыход да міграцыі, стаўячыся да гэтых людзей з вялікім спачуваннем, а не сустракаць іх калючым дротам і не разважаць пра тое, што з-за мігрантаў Еўропа будзе знішчана.

Нобелеўскі лаўрэат асудзіў, у прыватнасці, палітыку ўрада Вялікабрытаніі ў адносінах да бежанцаў. На яго думку, брытанскія ўлады настроены супраць тых, хто шукае прытулку. «Сёння здаецца, што ўрад даволі кепска ставіцца да людзей, якія шукаюць прытулку або якія шукаюць дазволу на ўезд у гэтую краіну. Для іх нечаканасцю з'яўляецца тое, што людзі, якія прыбылі з няпростых месцаў, хочуць прыехаць у квітнеючую краіну. Чаму яны дзівяцца? Хто б не захацеў прыехаць у больш шчаслівую краіну?» — сказаў Абдулразак Гурнэ.

Паводле яго слоў, уражваюць рашучасць і смеласць людзей, якія адпраўляюцца ў далёкае падарожжа, каб збегчы са сваіх краін для новага жыцця. Але ў грамадстве вакол мігранта ствараецца іншы вобраз. «Гэта нейкім чынам сканструявана так, як быццам міграцыя — гэта амаральна. Вы ведаеце, яны выкарыстоўваюць гэтую фразу — «эканамічны мігрант», нібы быць эканамічным мігрантам — гэта свайго роду злачынства. Мільёны еўрапейцаў на працягу стагоддзяў пакідалі свае дамы менавіта па гэтай прычыне і заваёўвалі свет менавіта па гэтай прычыне», — сказаў ён.

Кампетэнтна

**Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ:**

# «Наркотыкі — зло, якое прыносіць боль людзям ва ўсім свеце»

## Чаму павялічваецца колькасць передазіровак са смяротным зыходам і ці варта асцерагацца паступлення наркотыкаў з Афганістана?

**Упершыню аб праблеме наркаманіі ў Беларусі загаварылі ў пачатку 1980-х гадоў, калі былі зафіксаваны факты масавага злоўжывання наркотыкамі сярод моладзі Светлагорска. Уступленне шэрагу краін Усходняй Еўропы ў Еўрасаюз абярнулася для нашай дзяржавы і рэзкім павелічэннем знешняй наркапагрозы. Дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу, развітой транспартнай інфраструктуры, а таксама адкрытай граніцы з Расіяй, Беларусь усё часцей выкарыстоўваецца наркадылерамі як найбольш выгадны транзітны калідор для перамяшчэння забароненых псіхатропных рэчываў.**

Аднак рэдка калі ім удаецца пазбегнуць адказнасці. За гады службы супрацоўнікі міліцыі навучыліся не толькі вылічаць нарказлачынцаў, а нават прагназаваць іх дзеянні. Як гэта ўдаецца ва ўмовах, калі большасць наркотыкаў рэалізоўваецца праз інтэрнэт, а таксама чаму на хітрасці нарказлачынцаў трапляюць дзеці, напярэдадні 25-годдзя структуры расказаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ**.

***— Алег Канстанцінавіч, калі параўноўваць з чалавекам, 25 гадоў — гэта ўжо не дзіця, але і аб пэўным жыццёвым вопыце казаць яшчэ рана. Што зроблена за час існавання ўпраўлення, чым ганарыцеся?***

— У першую чаргу мы ганарымся сваім калектывам. За любым вынікам стаяць людзі. Яны адданыя сваёй справе, нават нягледзячы на спецыфіку нашай дзейнасці, якая часам і на шкоду сямейным адносінам. Работа па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі, як правіла, вячэрняя. Людзі, якія рэалізоўваюць наркотыкі, у асноўным, каб схавацца, імкнуцца скарыстацца цемрай. Але і нам трэба заставацца незаўважанымі. Час ідзе — мяняюцца метады, формы нашай дзейнасці. Калі раней, прыкладна ў 90 % выпадкаў наркотыкі передаваліся з рук у рукі, то цяпер (каля 80 % выпадкаў) яны распаўсюджваюцца шляхам закладак, выкарыстоўваецца пры гэтым інтэрнэт.

***— І гэта, безумоўна, ускладняе вам задачу...***

— Прычым кардынальна. Распаўсюджвальнікі наркотыкаў выкарыстоўваюць зашыфраваныя праграмы, як правіла, распрацаваныя спецслужбамі. Метадаў і спосабаў гэтых расшыфровак у нас, як і ў любой разведкі свету, пакуль няма. У той жа час мы таксама не стаім на месцы. Кіраўніцтва нас падтрымала, і цяпер у кожным абласным рэгіёне створаны аддзелы разведкі, вынікі працы якіх з году ў год даказваюць, што гэтае рашэнне было прынята невыпадкова.

***— За гэты час, які ідзе толькі на тое, каб пацвердзіць дачыненне чалавека да распаўсюджвання наркотыкаў, напэўна, можна раскрыць не адно іншае правапарушэнне?***

— Так, у нашай дзейнасці свая спецыфіка — наркотыкі трэба даказаць. У любым выпадку, яны павінны быць выяўлены пры зламысніку. Або варта сабраць усе доказы, якія сведчаць, што канкрэтны наркотык належыць той ці іншай асобе. Падчас працэсу можа высвятліцца, што такія выпадкі не адзінкавыя, таму правапарушальнікам на пэўны час удаецца пазбегнуць адказнасці. Аднак, як паказвае практыка, ненадоўга: прага лёгкіх грошай пераважае над розумам.

***— Беларусь доўгі час з'яўлялася заслонай ад паступлення наркатычных сродкаў у сумежныя дзяржавы...***

— Мы і сёння дакладна фіксуем каналы паступлення наркатычных сродкаў, праводзім вялікі сістэмны аналіз па міжнародных злачынцах, кантралюем іх перамяшчэнне. У межах выяўлення і ўстанаўлення асоб, якія гэтыя каналы арганізоўваюць, праводзім сумесныя мерапрыемствы з пагранкамітэтам, шчыльна ўзаемадзейнічаем з мытняй. У нас ёсць яркія прыклады папярэдніх затрыманняў, падчас якіх была канфіскавана самая вялікая партыя гераіну за гісторыю існавання ўпраўлення (каля 600 кілаграмаў). Нам удалося затрымаць усіх арганізатараў міжнароднай арганізаванай злачыннай групы, якая планавала даставіць наркотык у Еўропу. У цяперашні час па гэтым працэсе праходзяць судовыя пасяджэнні. Наркотыкі — зло, якое прыносіць боль людзям ва ўсім свеце, і, незалежна ад палітычных абставін, мы рабілі і будзем працягваць рабіць сваю справу.

***— Ці не ўскладнее ўзаемадзеянне з іншымі краінамі сітуацыя, якая апошнім часам адбываецца вакол Беларусі?***

— Вядома, ускладняе. Тыя еўрапейскія дзяржавы, з якімі мы суседнічаем, абмежавалі з намі свае зносіны, закрылі межы. Натуральна, гэта негатыўна адбіваецца на любой арганізацыі, якая праводзіць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы. Толькі бандыты карыстаюцца гэтым.

***— Нестабільная абстаноўка цяпер і ў Афганістане, які з'яўляецца радзімай гераіну. Ці варта нам асцерагацца росту паступлення наркотыкаў з гэтага напрамку?***



— Сітуацыю ў Афганістане мы трымаем на кантролі. Неўзабаве будзем супрацоўнічаць з прадстаўнікамі дзяржаў, якія суседнічаюць з гэтай краінай. Ужо пралічваем рызыкі, што адтуль можа павялічыцца паток наркатычных сродкаў. Калі раней мы асцерагаліся гераіну, то цяпер ёсць правераная інфармацыя, што з Афганістана пачалі паступаць і псіхатропныя рэчывы. Магчыма, у іх арганізаваны лабараторыі, адкуль будуць ажыццяўляцца спробы паставіць наркотыкі ў іншыя краіны. Беларусь — не выключэнне. З калегамі з АДКБ і ШАС мы будзем на гэтыя сітуацыі ўплываць.

***— Дзякуючы тым прафілактычным мерапрыемствам, якія праводзіце, ці ўдалося стабілізаваць абстаноўку на ўнутраным рынку? Магчыма, зменшылася колькасць смяротных выпадкаў?***

— Яшчэ ў 2019 годзе статыстыка ішла на змяншэнне. Мы разумелі, што гэта вынік нашай работы: з прафілактычнымі размовамі мы выязджаем у навучальныя ўстановы, працоўныя калектывы, дэманструем адпаведныя фільмы, запусцілі ролікі на радыёстанцыі. Мы разглядаем не толькі тых, хто знаходзіцца ў зоне рызыкі, — навучэнцаў і студэнтаў, працуем і з бацькамі, каб яны маглі хутчэй заўважыць гэтую праблему і паўплываць. Аднак ёсць шэраг фактараў, якія сведчаць аб тым, што наркапагроза захоўваецца. Колькасць передазіровак са смяротным зыходам, на жаль, у некаторых рэгіёнах краіны павялічваецца. Калі ўзяць апошні пяцігадовы перыяд, то не істотна. 70 % атручванняў, а таксама передазіровак са смяротным зыходам адбываецца ад ужывання метадону. Як правіла, ахвярамі наркотыку становяцца асобы 25—30-гадовага ўзросту, якія раней былі судзімыя або стаялі на ўліку — у асноўным гэта наркаманы са стажам, якія ведаюць аб наступствах, але ўсё роўна набываюць і ўжываюць наркотыкі.

***— А некаторыя, каб пазбегнуць адказнасці, прыдумляюць новае псіхатропнае рэчыва...***

— У гэтым плане Беларусь, у адрозненне ад іншых постсавецкіх дзяржаў, стварыла сістэму, якая даволі эфектыўна функцыянуе. Незалежна ад таго, ёсць у нас сам наркатычны сродак або не, мы маем яго назву і формулу. Рыхтуецца ліст, накіроўваецца ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, і яго прадстаўнікі ўносяць гэты наркотык у пералік забароненых рэчываў. Гэтая працэдура можа займаць не больш за тры дні. У іншых краінах падобнае рашэнне прымаецца на працягу ад некалькіх месяцаў да паўтара года. Раней, несумненна, такая праблема была і ў нас. Сёння, калі мы нешта канфіскоўваем і пры правядзенні экспертызы не ведаем, што гэта (праўда, апошнім часам я не чуў аб такім), рэчыва аўтаматычна будзе ўключана ў пералік забароненых.

***— Ці паўплывала на тэмпы распаўсюджвання наркотыкаў пандэмія?***

— Адназначна. Межы зачыніліся — складаней стала пастаўляць наркотыкі. Яны адразу выраслі ў цане. Інтэрнэт-крамы, якія займаюцца рэалізацыяй наркатычных сродкаў, адчулі дэфіцыт у пастаўцы тавару і пачалі перакупляць яго адзін у аднаго ў межах краіны. З'явіліся тыя, хто, нягледзячы на абмежаванні, спрабаваў паставіць наркотыкі з-за мяжы. Мы гэтых людзей фіксавалі і разам з пагранкамітэтам затрымлівалі. Ковід паўплываў і на буйны наркатрафік: транспарт хадзіў радзей, больш пільна ажыццяўляўся догляд, таму арганізатары асцерагаліся накіроўваць забароненыя рэчывы праз нашу краіну. Аднак праз некаторы час гэтыя спробы ўсё роўна ажыццяўляліся. Канфіскацыя буйной партыі гераіну мытным камітэтам — таму сведчанне.

***— Чаму ў пагоні за лёгкімі грашыма людзі не заўсёды ўсведамляюць адказнасць, якую панясуць за свае дзеянні?***

— Сярод тых, хто арганізоўвае распаўсюджванне наркотыкаў, ёсць вельмі тонкія псіхолагі. Карыстаючыся даверлівасцю людзей, яны ўнушаюць ім, што займаюцца бяспечным відам дзейнасці. У любой прапанове, якую яны распаўсюджваюць праз сацыяльныя сеткі, фігуруюць заробкі з вялікай колькасцю нулёў. Насамрэч усё адбываецца па-іншаму. Перш чым даць заданне раскласці наркотык, для таго каб быць упэўненым, што чалавек іх не падмане і не скарыстаецца ім сам, патрабуюць нешта ў заклад: напрыклад, пашпартныя даныя, якімі, калі нешта пойдзе не так, будуць шантажыраваць. Арганізатары не дапрацоўваюць наўмысна, бо добра разумеюць, што кожны закладчык працуе нядоўга: на яго хутка выходзіць міліцыя. Закладчык у наркабізнесе — расходны матэрыял. Прычым куратары самі могуць выдаць іх праваахоўным органам. Для іх абсалютна няважны лёс чалавека. Іх не цікавіць, што ў яго ёсць сям'я, што ён атрымае вялікі тэрмін і не хутка выйдзе на волю. Іх хвалююць толькі грошы. Аднак раней ці пазней наркадылеры панясуць адказнасць за свае злачынствы.

***— Толькі лёс чалавека ўжо будзе зламаны. Прычым нярэдка гэта датычыцца і зусім маладых людзей...***

— Існуе меркаванне, што да рэалізацыі наркотыкаў падлеткаў падштурхоўвае юнацкі максімалізм. Вядома, гэтага нельга выключаць. Ёсць нават прапанова ўстанавіць крымінальную адказнасць за збыт наркотыкаў з 16 гадоў (цяпер з 14). Мы супраць, бо рэалізатары гэтым абавязкова скарыстаюцца. У нашай практыцы ўжо ёсць выпадак, калі 13-гадовы падлетак пазбег адказнасці толькі з-за таго, што ён не дасягнуў адпаведнага ўзросту. Калі хлопцу споўнілася 14 гадоў, ён пераехаў са свайго рэгіёна ў Мінск, паступіў вучыцца ў сярэднюю спецыяльную ўстанову, знайшоў сабе дваіх таварышаў і арганізаваў збыт наркотыкаў. У выніку быў затрыманы і прыцягнуты да адказнасці.

***— Што падштурхоўвае падлеткаў на парушэнне заканадаўства?***

— Кожнае затрыманне таго ці іншага непаўналетняга аналізуецца. Праблема ў тым, што бацькі не ведаюць, чым займаюцца іх дзеці. Як паказвае практыка, мамам і татам з прычыны загружанасці не хапае часу на сваіх нашчадкаў.

***— Калі закрануць другі бок дзейнасці ўпраўлення — супрацьдзеянне гандлю людзьмі, — нават мяркуючы па стужцы навін, тут сітуацыя складваецца лепш...***

— У гэтым кірунку апошнім часам пераважаюць злачынствы, звязаныя з сексуальным складнікам. Трафікёры, якія знаходзяцца ў іншых дзяржавах, спрабуюць знайсці жывы тавар у асобе беларускіх дзяўчат. Як правіла, адбываецца гэта падманным спосабам: паабяцаўшы работу той жа афіцыянткі, дзяўчат прываблівают за мяжу, дзе прымушаюць займацца прастытуцыяй. Варта адзначыць, што тыя, хто на гэта пагаджаецца, прымаюць такое рашэнне добраахвотна. Асоб, якія ажыццяўляюць спробы заманіць за мяжу нашых дзяўчат, мы затрымліваем і даказваем іх дачыненне да гандлю людзьмі. Выпадкі, звязаныя з працоўнай эксплуатацыяй грамадзян, у нас практычна адсутнічаюць.

***— Затое ўсё часцей даводзіцца чуць аб затрыманні міліцыяй педафілаў, у тым ліку «серыйных».***

— За восем месяцаў гэтага года выяўлена 629 злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці або палавой свабоды непаўналетніх. Устаноўлена 506 дзяцей, у тым ліку 245 малалетніх, якія сталі ахвярамі педафілаў. Часта за такімі злачынствамі стаяць сваякі або асобы, якія сумесна пражываюць з непаўналетнімі. Выяўленне фактаў сексуальнай эксплуатацыі дзяцей ускладняецца нежаданнем некаторых дарослых і саміх ахвяр злачынства расказваць аб гвалце, які адбыўся. Яны тлумачаць гэта тым, што калі інфармацыя стане камусьці вядомай, то рэпутацыя непаўналетняга і сям'і, дзе ён выхоўваецца, будзе сапсаваная. Гэта становіцца ўспрымаецца педафіламі, якія працягваюць здзяйсняць аналагічныя злачынствы ў дачыненні да іншых дзяцей. Дзеля сваіх мэт зладзеі актыўна карыстаюцца сучаснымі тэхналогіямі, таму бацькам варта звяртаць увагу на тое, чым займаюцца іх дзеці ў інтэрнэце.

Профі

# ЛЁГКІХ ГРОШАЙ НЕ БЫВАЕ

## Супрацоўнікі міліцыі спынілі дзейнасць буйной наркалабараторыі

**Калі вясной мінулага года грамадзянін К. уладкаваўся ў адну з інтэрнэт-крам у якасці закладчыка наркотыкаў, ён, напэўна, здагадваўся, чым усё можа скончыцца. Аднак прага вялікіх і хуткіх грошай узяла сваё, і аб наступствах малады чалавек пачаў задумвацца ўжо радзей...**

Ён не быў наркаманам, хоць і спрабаваў у свой час наркатычныя і псіхатропныя сродкі. Проста хацеў зарабіць. Прычым спосаб заробку выбраў сам. Атрымліваў наркотык, расфасоўваў яго на больш дробныя часткі і раскладваў у розных месцах сталіцы: там, дзе давала ўказанні інтэрнэт-крама. Малады чалавек асвойваў новую «спецыяльнасць» — закладчыка або «мінёра», як называюць такіх людзей у наркаасяроддзі.

Не за гарамі грамадзяніна К. чакала павышэнне па кар'ернай лесвіцы. Яму прапанавалі стварыць лабараторыю і вырабляць там наркатычныя, а таксама псіхатропныя рэчывы. Мужчына з лёгкасцю пагадзіўся — заробак абяцалі ўжо з большай колькасцю нулёў.

Па рэкамендацыі інтэрнэт-крамы малады чалавек арандаваў гараж у гарадскім пасёлку Мачулішчы, што каля Мінска. Невядомыя асобы даставілі туды абсталяванне і рэагенты для вырабу наркотыкаў. У вызначаны дзень грамадзянін К. атрымаў заданне забраць усё з гаража і перавезці ў іншае месца — у адну з хат у вёсцы Каралішчавічы Мінскага раёна, якую напярэдадні арандаваў. Ён яшчэ не ведаў, што знаходзіцца ў каністрах, а таксама для чаго неабходна абсталяванне, якое разам са сваім знаёмым яны перавезлі на новае месца. За маладым чалавекам ужо сачылі супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама.

Калі з грамадзянінам К. звязаліся з інтэрнэт-крамы і папрасілі прыгатаваць псіхатропнае рэчыва, ён адразу пагадзіўся. Па месенджары яму даслалі падрабязную інструкцыю. Рэагенты і абсталяванне, неабходныя для вырабу наркотыкаў, былі ў тых самых каністрах і каробках, якія ён напярэдадні перавёз. Змешваў «інгрэдыенты» малады чалавек пад строгім указаннем свайго работадаўца, які падрабязна раскрываў «сакрэты» прыгатавання. Зламыснік, у сваю чаргу, паспехі «кулінарнай дзейнасці» здымаў на відэа, якія дасылаў свайму куратару. Раптам нешта пайшло не так...



Доказы, без якіх складана было б даказаць віну падазраванага.

У адзін з дзён ён выйшаў з хаты, зачыніў яе на замок і паехаў у бок вакзала. Набыў білет да Масквы і сеў у аўтобус. Аператыўнікі, якія ўвесь час сачылі за падазраваным, зразумелі: для вырабу наркотыкаў нечага не хапае. І пачалі чакаць.

— Спешка ў нашай справе можа толькі нашкодзіць, — адзначае **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Мінскага РУУС падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый БЕЛАВУШКА**. — Дачыненне да захоўвання, збыту або вытворчасці наркотыкаў заўсёды патрабуе доказу. Тое, што грамадзянін К. прывёз у арандаваную хату ў Каралішчавічах, магло ўяўляць сабой звычайныя хімічныя рэчывы, якія, як хутчэй за ўсё паказала б правядзенне экспертызы, не з'яўляюцца наркатычнымі сродкамі. У такім выпадку пры затрыманні раней тэрміну сапраўдны намер даказаць было б цяжка. Калі мы арыштавалі мужчыну непасрэдна падчас вырабу наркотыкаў, яго злачынная дзейнасць была навідавоку.



Наркалабараторыя.

Як высветлілася пазней, у сувязі з адсутнасцю ведаў у прыгатаванні наркотыкаў грамадзянін К. вывеў са строю адно з абсталяванняў, неабходных для вырабу небяспечнага рэчыва. Акурат па яго і паехаў у суседнюю краіну. Падазраваны вярнуўся з Масквы праз два дні. Зачыніўся ў доме і зноў распачаў працэс прыгатавання. Усю ноч у вокнах гарэла святло. У тым, што ў гэты час там ажыццяўляўся выраб псіхатропных або наркатычных рэчываў, супрацоўнікі міліцыі ўжо не сумняваліся — на вуліцы стаяў рэзкі пах хіміі. Калі мужчына выйшаў на вуліцу па ваду (цэнтральнае водазабеспячэнне ў доме адсутнічала), ён быў затрыманы праваахоўнікамі.

У гэты час у хаце ўжо стаяла пяцілітровая колба з практычна гатовым асабліва небяспечным псіхатропным рэчывам. Падчас агляду аператыўнікі канфіскавалі астатнія ёмістасці, абсталяванне, а таксама каля 300 літраў прэкурсору (кампанента, з якога робяцца наркатычныя сродкі). Зыходзячы з разлікаў спецыялістаў, гэтага павінна было хапіць на выраб прыкладна 10–15 кілаграмаў гатовага наркотыку.

Малады чалавек, якога затрымалі, прайшоў шлях ад дробнага «мінёра» і аптовага закладчыка да арганізатара наркалабараторыі. Быў асуджаны на 11 гадоў пазбаўлення волі. Акрамя таго, пастанаўленнем суда прадугледжаны штраф і канфіскацыя маёмасці. На таго, хто кіраваў злачыннай дзейнасцю праз месенджар, супрацоўнікі міліцыі пакуль не выйшлі. Затое затрымалі яшчэ аднаго чалавека, які працаваў у інтарэсах згаданай інтэрнэт-крамы.

Як заўважае **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Мінскага аблвыканкама палкоўнік міліцыі Сяргей БЕЛАВУШКА**, тэхналогіі сёння не стаяць на месцы, аднак, на жаль, імі карыстаюцца і зламыснікі. «У апошнія некалькі гадоў культура наркаспажывання кардынальна памянялася, — акцэнтуе ўвагу афіцэр. — Калі раней збыт наркотыкаў адбываўся з рук у рукі, то цяпер з'явіліся спецыялізаваныя інтэрнэт-пляцоўкі, дзе канцэнтруюцца крамы па продажы наркотыкаў. У большасці выпадкаў небяспечныя рэчывы рэалізоўваюцца праз крыптавалюту. Гэта, безумоўна, ускладняе нам задачу. Толькі мы таксама не стаім на месцы: распрацоўваем новыя методыкі, якія дазваляюць выяўляць лабараторыі і каналы, па якіх распаўсюджваюцца наркотыкі».

**Фота з архіва УУС Мінаблвыканкама.**

Рэзананс

# ПА «КЛУБНІЧНЫХ» СЛЯДАХ

## Як сутэнёры спрабавалі вывезці за мяжу беларускіх дзяўчат, і хто схіляў да прастытуцыі непаўналетніх

**Затрыманняў, звязаных з гандлем людзьмі, у параўнанні з незаконным абаротам наркотыкаў, апошнім часам становіцца ўсё менш. У першую чаргу гэта звязана з пандэміяй, якая паўплывала на закрыццё меж. Па-другое, усё менш грамадзян пагаджаецца на прапановы сутэнёраў.**

### ГАНДАЛЬ ДЗЕЦЬМІ

Поўнасцю выкараніць найстаражытнейшую прафесію ў нашым грамадстве пакуль не атрымліваецца. Для некаторых гэта свайго роду бізнес. У пагоні за грашыма «прадпрымальнікі», якія ў прамым сэнсе зарабляюць на людзях, часта да апошняга не вераць, што могуць трапіць у поле зроку праваахоўнікаў.

Выйсці сухім з вады планаваў і грамадзянін Ш. Жыхар Рэчыцы нідзе не вучыўся, не працаваў. Грошы зарабляў на тым, што шукаў у інтэрнэце маладых дзяўчат, часта непаўналетніх, звозіў іх у Мінску з кліентамі. Пасля аказання інтым-паслуг атрымліваў грошы, пэўным працэнтам дзяліўся з дзяўчатамі — у выніку ўсе былі задаволены.

Трэба адзначыць, што на момант, калі грамадзянін Ш. займаўся злачыннай дзейнасцю, ён сам быў непаўналетнім. Акрамя таго, хлопец ужываў наркотыкі, якія прапаноўваў і сваім знаёмым. Сярод тых, каго малады чалавек «пасадзіў на іглу», былі і 13—14-гадовыя.

Злачынца працягваў схіляць малалетніх да прастытуцыі. Пасля лячэння ў псіханеўралагічнай бальніцы ён зноў прыехаў у Мінск. Калі сутэнёр чарговы раз звёў дзяўчыну з кліентам, ён не ведаў, што гэтым так званым кліентам быў старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах. Малаодга чалавека вырашылі пакуль не затрымліваць, затое падрабязна дапыталі прастытутку, якой аказалася 14-гадовая школьніца з Гомеля. Як высветлілася, пакуль яе бацькі адпачывалі ў Егіпце, падлетак такім чынам вырашыла зарабіць. Сутэнёра арыштавалі праз некалькі дзён каля здымнай кватэры ў сталіцы. Акурат у гэты час кліента чакала чарговая ахвяра злачыннай дзейнасці (ёй таксама не было 18).

Следства яшчэ ідзе. Аднак ужо зразумела, што маладому чалавеку такі від заробку абыдзецца вельмі дорага — яму пагражае ад 5 да 10 гадоў пазбаўлення волі. І наўрад ці хтосьці з яго родных будзе аспрэчваць рашэнне суда: айчым-алкаголік ніколі не меў дачынення да выхавання свайго пасынка, маці даўно ў жыцці сына ніякага ўдзелу не прымала. Магчыма, каб у сям'і былі іншыя адносіны, такога б раскладу, які кардынальна вырашыў лёс маладога чалавека, не адбылося.

— Як правіла, малалетнія, якія займаюцца прастытуцыяй, выхоўваюцца ў няпоўных або ў сем'ях са складаным становішчам, — адзначае **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах аддзела супрацьдзеяння гандлю людзьмі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама маёр міліцыі Максім ЯЛОВІК**. — Недахоп бацькоўскай увагі, часта абыякавасць да жыцця ўласнага дзіцяці прыводзяць да такіх сумных наступстваў. Прычым ахвяры гандлю людзьмі свядома пагаджаюцца на такі від дзейнасці з мэтай зарабіць грошай. З непаўналетнімі, якія выступаюць у нас сведкамі па крымінальных справах, потым працуе інспекцыя па справах непаўналетніх.

### ВЯРБОЎКА НЕ ЎДАЛАСЯ

У памяці супрацоўніка міліцыі і той зімовы дзень, калі за дзесяць хвілін да заканчэння працоўнага дня яму патэлефанавала дзяўчына і расказала, што ёй прапаноўваюць выехаць за мяжу для таго, каб займацца прастытуцыяй. Праз кароткі час з Максімам Яловікам звязаўся калега з Ленінскага РУУС і расказаў пра аналагічны зварот у іх падраздзяленне. Як высветлілася, хоць і паступіла інфармацыя з розных крыніц, але датычылася яна адных і тых жа сутэнёраў.

Мужчына, які прадставіўся супрацоўнікам аднаго з элітных салонаў Масквы, прапанаваў беларускам работу, звязаную з аказаннем інтымных паслуг за матэрыяльнае ўзнагароджанне. Калі б яны пагадзіліся на прапанову, то пражывалі б у двухпакаёвай кватэры ў цэнтры Масквы за кошт работадаўца. Заробак ім абяцалі ад 200 тысяч расійскіх рублёў кожнай. Каб абмеркаваць умовы паездкі, ужо пад кантролем міліцыі адна з іх сустрэлася з вярбоўшчыкамі. З размовы высветлілася, што мужчыны (адзін з іх быў грамадзянінам Расійскай Федэрацыі, другі — нашым суайчыннікам) набіраюць у Мінску дзяўчат для работы, звязанай з прастытуцыяй на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.



Увечары, калі была запланавана паездка, грамадзянкі, якія фіктыўна пагадзіліся на прапанову мужчын, чакалі машыны ў адной з мінскіх кватэр. Чакалі трафікёраў і аператыўнікі. Калі дзяўчаты селі ў аўтамабіль і крыху праехалі, супрацоўнікі міліцыі спрабавалі спыніць транспарт. Каб пазбегнуць затрымання, кіроўца заблакіраваў дзверы і націснуў на газ. Не абышлося без стральбы. Галоўных фігурантаў крымінальнай справы прызналі вінаватымі. Найбліжэйшыя пяць гадоў яны правядуць у месцах не вельмі аддаленых.

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2021.Б.002.00036

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «ВТП», УНП 391418293, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 13-9Б/2020 в экономическом суде Витебской области**

Номер лота, вид выставляемого на первые повторные электронные торги имущества:

Лот № 1: недвижимое имущество.

**Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-45411, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 39-й Армии, 54/2, площадь – 118,6 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная большая.**

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000352 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 39-й Армии, общей площадью 1,9682 га, целевое назначение зем. участка – земельный участок для обслуживания магазина и производственных зданий, предоставленном в общее долевое право аренды, доля Общества с ограниченной ответственностью «ВТП»: 1/100.

**Начальная цена**: 26 390,00 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена:** 7540,00 белорусских рублей без НДС.

**Условия первых повторных электронных торгов**: Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, согласно сметы затрат, и оплатить услуги ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов**: 26.10.2021 с 9.00 до 16.00.**

Первые повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Для участия в первых повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 25.10.2021.

**Задаток по лоту № 1** в сумме 2639,00 (две тысячи шестьсот тридцать девять рублей 00 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 29 711-43-22.

Контактный телефон для осмотра объектов + 375 29 711-43-22.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8(0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов): в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения предмета электронных торгов по предварительному согласованию с Продавцом.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат и прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

## СВЕТЛОГОРСКИЙ ФИЛИАЛ ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА
### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (здание магазина) с инвентарным номером № 342/С-229566, площадью 126 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, д. Островчицы, на земельном участке с кадастровым номером 325083205601000006 | **9 120,00 руб.** | **912,00 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 05 ноября 2021 г.** в рабочие дни с 8.30 до 17.30 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Спортивная, 11 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **09 ноября 2021 г. в 11.00** по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Спортивная, 11 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY93BAPB30152901000130000000, БИК: BAPBBY2X в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, УНП 400158558. Получатель платежа: Светлогорский филиал Гомельского областного потребительского общества<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете «Звязда» от 09.10.2021 г. |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона. Срок оплаты – определяется по согласованию с собственником имущества при заключении договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.<br>В случае наличия единственного участника подавшего заявку (заявление), либо единственного участника, явившегося для участия в торгах, имущество, являющееся предметом торга, продается по цене, увеличенной на 5 %.<br>Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение торгов, в т. ч. расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения |

Порядок проведения аукциона и перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе оговорен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже движимого и недвижимого имущества, утвержденного постановлением Гомельского облпотребобщества № 360 от 31.12.2020

**Дополнительная информация по тел.: (02342) 2 14 55, +375 29 129 50 33**

## ООО «ИПМ-КОНСАЛТ ОЦЕНКА» ИНФОРМИРУЕТ:

В извещение о проведении открытого аукциона (**29.10.2021** в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703) по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «МОТОВЕЛО»**, опубликованном в газете «Звязда» от 28.09.2021, вносится изменение: «**Условия оплаты предмета аукциона**» читать как: «Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона»

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. Сайт: www.ipmtorgi.by**

УНП 190017558

## Извещение о проведении 12 ноября 2021 года торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе и в подвижном составе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

| № предмета торгов | Место размещения средства рекламы (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Количество и размер средства рекламы | Материал изготовления средства рекламы | Срок действия договора | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Станция метро «Грушевка» | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 6 ед. | алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 28 декабря 2021 года по 27 декабря 2026 года | 668,45 |
| 2 | Станция метро «Михалово» | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 8 ед. | | | 891,26 |
| 3 | Станция метро «Октябрьская», ВБ-1 | рекламный стенд без подсветки (растяжка над эскалаторным спуском) | 5,0 м х 1,5 м – 1 ед. | баннерная ткань (**) (способ крепления – талреп М12, металлический трос 5 мм) | с 25 января 2022 года по 24 января 2027 года | 1 037,41 |
| 4 | Станция метро «Юбилейная площадь» | лайт-бокс (*) | 5,0 м х 1,3 м – 1 ед. | алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 15 декабря 2021 года по 14 декабря 2026 года | 88,50 |
| 5 | Станция метро «Пушкинская», ВБ-2 | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 4 ед. | алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 15 декабря 2021 года по 14 декабря 2026 года | 900,00 |
| | | плазменный (жидкокристаллический) дисплей без аудиоконтента | 0,6 м х 1,0 м – 1 ед. | - | | |
| 6 | Станция метро «Могилевская», ВБ-2 | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 1 ед. | алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 15 декабря 2021 года по 14 декабря 2026 года | 177,00 |
| 7 | Станция метро «Уручье», ВБ-1 | лайт-бокс (*) | 2,0 м х 1,0 м – 1 ед. | | | 265,50 |
| 8 | Станция метро «Уручье», ВБ-2 | лайт-бокс (*) | 2,0 м х 1,0 м – 2 ед. | | | 531,00 |
| 9 | Станция метро «Институт культуры», ВБ-1 | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 4 ед. | | | 708,00 |
| 10 | Станция метро «Академия наук», ВБ-2 | лайт-бокс (*) | 2,25 м х 1,2 м – 4 ед. | алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло | с 15 декабря 2021 года по 14 декабря 2026 года | 1 060,80 |
| | | рекламный стенд без подсветки (***) | 2,0 м х 1,0 м – 2 ед. | алюминиевая рамка, лист ПВХ, самоклеящаяся пленка (**) | | |
| 11 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 мм х 315 мм | рекламный плакат формата А4 (210 мм х 297 мм) | По первой линии – в 33-х составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны, верхний ряд – 18 ед. Итого: по 1-й линии: 2 970 ед. | немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150–170 г/м$^2$ | с 4 января 2022 года по 3 января 2025 года | 51 667,16 |

**Необходимые условия оплаты услуг по размещению рекламы:**

*- цена продажи предмета торгов учитывается в счет оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 1-й месяц размещения;*

*- победитель торгов (лицо, приравненное к победителю торгов) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов обязан перечислить на счет государственного предприятия «Минский метрополитен» обеспечение исполнения договора. Обеспечение исполнения договора предоставляется на сумму, равную сумме цене продажи предмета торгов, и учитывается в счет оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 12-й месяц (исполнение договора) или 1 (один) последний месяц при досрочном расторжении договора либо при отказе от исполнения договора;*

*- условием оплаты услуг по размещению рекламы является предоплата за текущий месяц в размере 100 % в первые 3 рабочих дня текущего месяца;*

*- стоимость услуг по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и установленная договором, действует на первые 12 месяцев размещения, в дальнейшем ежегодно стоимость услуг по размещению рекламы пересчитывается путем увеличения на индекс потребительских цен;*

*- по предмету торгов № 11 стоимость услуг по размещению рекламы в подвижном составе, определенная по итогам аукциона и установленная договором, подлежит перерасчету в связи с изменением графика движения поездов в Минском метрополитене в летний период, а также в случае обновления действующего подвижного состава (изменения количества) пропорционально количеству вагонов подвижного состава.*

**(*) Необходимые условия по размещению рекламы:**

*1. Разработать проект крепления рекламных конструкций и согласовать с государственным предприятием «Минский метрополитен»;*

*2. Разработать проектную документацию по электроснабжению и согласовать с энергоснабжающей организацией, РУП «Минскэнерго» филиал «Энергосбыт» и ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор»;*

*3. Получить в государственном предприятии «Минский метрополитен»:*

*- технические условия на присоединение электроустановок к электрическим сетям Минского метрополитена;*

*- акт разграничения балансовой принадлежности электрических сетей (электроустановок) и эксплуатируемой ответственности сторон (стоимость – 1,5 базовой величины);*

*4. Заключить договор на технологическое присоединение (подключение) электроустановок к электрическим сетям Минского метрополитена (стоимость подключения – 2,5 базовой величины);*

*5. Предоставить проект подключения рекламных конструкций на станциях метрополитена к сети электроснабжения Минского метрополитена;*

*6. Заключить договор на снабжение электрической энергией с государственным предприятием «Минский метрополитен»;*

*7. Средства рекламы (лайт-боксы, жидкокристаллический дисплей) передаются государственному предприятию «Минский метрополитен» в безвозмездное пользование на весь срок действия договора об оказании услуг по размещению рекламы.*

**(**)** *При заключении договора победителю торгов (лицу, приравненному к победителю торгов) необходимо представить в государственное предприятие «Минский метрополитен» действующий документ, подтверждающий соответствие материала изготовления средств рекламы группе горючести Г1 по ГОСТ 30244-94.*

***(***)** Разработать проект крепления рекламных конструкций и согласовать с государственным предприятием «Минский метрополитен».*

*По предметам торгов №№ 1–10 в течение срока действия договора об оказании услуг по размещению рекламы по письменному обращению заказчика (не менее чем за 60 дней до предполагаемой даты размещения) возможна замена средств рекламы, размещенных в соответствии с договором, на иные сложно-технические средства рекламы. При этом необходимым условием является разработка и согласование с государственным предприятием «Минский метрополитен» проектов крепления и подключения новых рекламных конструкций к сети электроснабжения Минского метрополитена. Трансляция рекламного изображения должна осуществляться без аудиоконтента.*

**Форма проведения торгов** – аукцион.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Государственное юридическое лицо** – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **12 ноября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 12.10.2021 **по 08.11.2021** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающего принять участие в торгах.

*Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583 (назначение платежа – задаток для участия 12.11.2021 в торгах на право заключения договора на размещение средств рекламы по предмету торгов №_).*

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются: физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором на размещение средств рекламы);
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – **www.metropoliten.by,** Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

# ЗАДЗЕЙНІЧАНЫ ЎСЕ РЭСУРСЫ

### ПЛАНАВАЯ ДАПАМОГА АБМЕЖАВАНАЯ. ШТО ГЭТА АЗНАЧАЕ?

Каардынатар на ўваходзе ў паліклініку, здаецца, стаў звыклай для нас з'явай яшчэ з першай хвалі каранавіруса. Вам не толькі памераюць тэмпературу, але і пацікавяцца мэтай візіту. Пацыентаў з павышанай тэмпературай накіроўваюць у інфекцыйны блок — з асобнага ўваходу. Тут жа можна выклікаць урача на дом — каардынатар перадасць неабходную інфармацыю з вашымі данымі ў стол даведак. Некаторым пацыентам нагадваюць, што рэцэпт цяпер можна заказаць на сайце паліклінікі ці па тэлефоне, для гэтага неабавязкова прыходзіць. Асабліва гэта датычыцца пажылых людзей. Дарэчы, на сайтах паліклінік з канца верасня з'явіліся аб'явы з просьбай адмовіцца ад неабавязковага наведвання паліклінікі ў сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкай. Магчыма, таму, што многія да яго прыслухоўваюцца, ёсць адчуванне, што ў калідорах наведвальнікаў менш, чым звычайна. Толькі да кабінетаў, дзе вядуць прыём урачы агульнай практыкі, сядзяць па некалькі чалавек.

**«Ні ў якім разе не трэба зацягваць і чакаць, «што будзе далей». Своечасова пачатае лячэнне папярэдзіць развіццё цяжкага захворвання».**

— З 22 верасня, згодна з загадам камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, абмежавана аказанне планавай медыцынскай дапамогі, — кажа Ірына Болдырава. — Яна не адменена цалкам, але колькасць талонаў, якія выдаюцца пацыентам па папярэднім запісе да ўрачоў-спецыялістаў (іх замаўляюць толькі па тэлефоне ці праз інтэрнэт), зменшана. Пры гэтым цалкам адменены талоны да ўрачоў агульнай практыкі. Яны цяпер пераважна задзейнічаны для аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з рэспіраторнымі захворваннямі, у тым ліку пацыентам з COVID-19. Разам з тым урачы-спецыялісты, улічваючы, што ў іх абмежаваны прыём па талонах, таксама прыцягваюцца да аказання медыцынскай дапамогі дадзенай катэгорыі пацыентаў.

Урачы-спецыялісты пасля прыёму па талонах накіроўваюцца ў інфекцыйны блок, дзе аглядаюць пацыентаў з прыкметамі вострых рэспіраторных вірусных інфекцый. Ён працуе з 8 раніцы да 20 гадзін. На прыёме тут штодзень ад адна да трох урачоў. Самыя загружаныя дні — панядзелак і пятніца, таму пацыентаў прымаюць адначасова тры ўрачы. А вось у аўторак, сераду і чацвер наведвальнікаў менш — спраўляюцца, як правіла, два ўрачы. Нярэдка на прыёме ў інфекцыйным блоку можна ўбачыць і галоўнага ўрача, і намеснікаў. Ва ўмовах складанай эпідэміялагічнай абстаноўкі дапамогу пацыентам аказваюць літаральна ўсе медыкі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Колькасць пацыентаў мы адсочваем кожную гадзіну. Аператыўна рэагуем на павелічэнне чаргі, і пакуль пытанняў не ўзнікае. І я, і мае намеснікі таксама вядзём прыём, каб пацыенты доўга не чакалі, — кажа Ірына Мікалаеўна.

Работа ўсіх падраздзяленняў паліклінікі адпрацавана яшчэ ў папярэднія хвалі каранавіруснай інфекцыі. Дзённы стацыянар, напрыклад, працягвае сваю работу, але па абмежаваным графіку — усяго тры гадзіны ў дзень. Тут аказваюць дапамогу пацыентам, якія знаходзяцца ў перыядзе часовай непрацаздольнасці. Гэта, скажам, праблемы са спінай, абвастрэнні бранхіяльнай астмы, бранхіты і іншыя захворванні, пры якіх не дапамагае амбулаторнае лячэнне і патрэбны, напрыклад, курс кропельніц. У астатні час урач дзённага стацыянара задзейнічаны ў аказанні дапамогі пацыентам з прыкметамі рэспіраторных захворванняў. А вось работа аддзялення фізіятэрапіі часова спынена. Яго персанал цяпер працуе ў інфекцыйным блоку, медсёстры задзейнічаны ў якасці каардынатараў у холе паліклінікі ці дапамагаюць на прыёме ўрачам агульнай практыкі.

Да асенняга ўздыму захваральнасці паліклініка рыхтавалася загадзя. Закуплены сродкі індывідуальнай аховы для ўрачоў, медыцынскіх сясцёр, санітарак — іх запас складае ад двух да трох месяцаў. У дастатковай колькасці маюцца экспрэс-тэсты на COVID-19, якія вызначаюць наяўнасць імунаглабулінаў M і G.

### РЭЦЭПТЫ — ПА ТЭЛЕФОНЕ І ПРАЗ САЙТ

Медыкі нагадваюць, што пацыентам, асабліва пажылым, не рэкамендуецца лішні раз прыходзіць у паліклініку. Гэта дазволіць пазбегнуць неабавязковых кантактаў, у тым ліку і з хворымі наведвальнікамі. Па рэцэпт можна звярнуцца праз рэгістратуру па тэлефоне. Медрэгістратар высветліць, ці ёсць пагаршэнні здароўя. Калі іх няма і пацыента раней аглядаў урач, прапануюць пакінуць свой тэлефон. Пасля патэлефануе ўрач, высветліць, якія неабходны рэцэпты, і медсястра даставіць іх пацыенту. Калі пацыента не аглядаў урач, ён зробіць візіт на дом.

Цяпер ёсць магчымасць заказаць рэцэпты і праз сайт. Гэта опцыя больш падыходзіць для ўпэўненых карыстальнікаў інтэрнэту, але пажылым людзям тут могуць дапамагчы іх дзеці ці іншыя блізкія. У заяўцы варта ўказаць, калі пацыент быў агледжаны ўрачом, якое прызначана лячэнне і просьбу для яго працягу выпісаць рэцэпты. З пацыентам таксама звяжуцца па тэлефоне і даставяць рэцэпты на дом.




— Мы пастаянна вядзём актыўную тлумачальную работу. Да ўздыму захваральнасці, напрыклад, нашы медыкі праводзілі сустрэчы з пажылымі людзьмі ў тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнай абароны, дзе нагадвалі пра меры перасцярогі, у тым ліку заклікалі максімальна абмяжоўваць наведванне месцаў масавага збірання людзей, у прыватнасці паліклінікі. Калі дрэнна сябе адчуваеце, лепш выклікаць урача на дом, — кажа Ірына Болдырава.

Парадак работы з пацыентамі, якія хварэюць на каранавірусную інфекцыю і лечацца амбулаторна, а таксама з кантактамі першага ўзроўню не змяніўся. Праўда, у адпаведнасці з загадам Міністэрства аховы здароўя № 900, зменшылася колькасць дзён самаізаляцыі. Назіранне за пацыентамі па-ранейшаму ажыццяўляюць кантактныя брыгады — як урачэбныя, так і сястрынскія. З уздымам захваральнасці іх колькасць павялічана. Урачэбная брыгада робіць агляд хворых, сястрынская выконвае забор мазкоў.



— Рост захваральнасці адзначаецца, але піку, які быў у папярэднія хвалі, мы яшчэ не дасягнулі, — канстатуе галоўны ўрач. — Аднак цяпер, у адрозненне ад папярэдніх хваль, людзі страцілі пільнасць у нашэнні масак і іншых мер перасцярогі. Нават пры ўваходзе ў паліклініку цяпер даводзіцца і прапаноўваць, і прымушаць надзяваць маскі.

### АХВОТНЫХ ПРЫШЧАПІЦЦА СТАЛА БОЛЬШ

Што датычыцца вакцын, то ў цяперашні час у паліклініцы маецца тры віды: кітайская Vero Cell, «Спадарожнік V» (беларускай вытворчасці) і «Спадарожнік Лайт» (расійскай вытворчасці). Вакцыны дастаткова, прышчапляюць усіх ахвотных — нават тых, хто не замацаваны за паліклінікай тэрытарыяльна. Па назіраннях медыкаў, у апошнія тыдні прышчапляцца сталі актыўней, але гэта датычыцца пераважна пажылых людзей. Моладзі перад працэдурным кабінетам, які, дарэчы, працуе цэлы дзень з нявялікімі перапынкамі на дэзынфекцыю, не так шмат.

Для пажылых людзей, якія абмежаваны ў перамяшчэнні, арганізаваны брыгады, што выязджаюць на дом. У вызначаныя дні, калі набіраецца пэўная колькасць ахвотных (ампулы вакцыны разлічаны на некалькі чалавек), брыгада выязджае да пенсіянераў. Вакцыну перавозяць у спецыяльных тэрмасумках. Праз 21 дзень пацыентам робіцца паўторная прышчэпка.

Выязджаюць медыкі і ў працоўныя калектывы. Прышчапіцца выказалі жаданне і супрацоўнікі прыватнага медыцынскага цэнтра, работнікі камвольнага камбіната, настаўнікі школ, персанал дзіцячых садкоў.

— Колькасць ахвотных вакцынавацца цяпер павялічваецца. У першую чаргу за кошт асоб, якія працуюць з людзьмі. Усё больш запытаў мы атрымліваем ад дзіцячых садкоў, школ, іншых арганізацый сацыяльнай сферы. У нас, дарэчы, прышчапіліся 98 % нашых супрацоўнікаў, — гаворыць Ірына Болдырава.

Большай папулярнасцю пакуль карыстаецца кітайская вакцына. Цяпер, дарэчы, у паліклініках з'явілася аднакампанентная расійская вакцына «Спадарожнік Лайт». Яна прызначана для студэнтаў, навучэнцаў дзённай формы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, прызыўнікоў. Калі вы не вызначыліся з вакцынай, перад прышчэпкай падчас агляду ўрач растлумачыць усе перавагі кожнай з іх і парэкамендуе найбольш падыходзячую з улікам вашага стану здароўя. Па-ранейшаму прышчапіцца можна ў выязных пунктах, арганізаваных у гандлёвых цэнтрах, тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання і інш. Медыкі 11-й гарадской паліклінікі выязджаюць у такія пункты, якія працуюць у гандлёвым цэнтры «Карона», доме-інтэрнаце для ветэранаў.

**«Рост захваральнасці адзначаецца, але піку, які быў у папярэднія хвалі, мы яшчэ не дасягнулі».**

Напрыканцы размовы Ірына Мікалаеўна звяртае ўвагу на яшчэ адну важную рэч. Пры з'яўленні першых сімптомаў хваробы не варта чакаць, што ўсё пройдзе само.

— Пры з'яўленні першых прыкмет рэспіраторнага захворвання — кашлю, пяршэння, болю ў горле — трэба звярнуцца да ўрача. У нас амбулаторная дапамога вельмі даступная — можна прыйсці ў паліклініку самастойна ці выклікаць урача на дом. Калі стан дазваляе, то лепш прыйсці, каб урач паслухаў, правёў дыягностыку, прызначыў неабходныя аналізы і вызначыўся з тактыкай лячэння. Ні ў якім разе не трэба зацягваць і чакаць, «што будзе далей». Своечасова пачатае лячэнне папярэдзіць развіццё цяжкага захворвання. Важна абавязкова насіць маску, захоўваць дыстанцыю, апрацоўваць рукі, прышчапляцца — выконваць усе меры, якія вядомы. Іх захаванне дазваляе пазбегнуць непажаданых наступстваў.

**Алена КРАВЕЦ.**



# З ПОШТЫ — З ДОБРЫМ НАСТРОЕМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі мне зрабілі падобную прапанову — узначаліць РУП «Белпошта», гэта стала сапраўднай нечаканасцю. Не ведала, ці спраўлюся з такім шырокім колам задач. Здаецца, што паштовая і электрасувязь — адна галіна, але розная спецыфіка работы прадпрыемстваў. Вось гэта мяне ў першую чаргу хвалявала. Дзякуючы той камандзе прафесіяналаў, якая склалася ў кіраўніцтве РУП «Белпошта», на новай пасадзе я адаптавалася даволі хутка, і прадпрыемства, на мой погляд, працуе належным чынам.

***— Якія найбольш значныя змены адбыліся ў сістэме паштовай сувязі краіны апошнім часам?***

— За тыя гады, што я працавала ў «Белтэлекаме», мне даводзілася сутыкацца з работай пошты, але не настолькі блізка. Калі перайшла на РУП «Белпошта», зрабіла для сябе шмат новых адкрыццяў. Раней я ўяўляла пошту як дастаўку лістоў, паштовак, пасылак, але калі зазірнула глыбей, то зразумела, што гэта вельмі вялізны комплекс усялякіх паслуг, да таго ж актыўна развіваюцца асобныя кірункі дзейнасці.

У работу паштовай службы шырока ўкараняюцца аўтаматызацыя і лічбавізацыя вытворчых працэсаў, як, зрэшты, і ў іншых галінах беларускай эканомікі. Уводзіцца шэраг дадатковых сэрвісаў. Сёння мы запусцілі нацыянальную электронную паштовую сістэму, а гэта новыя сучасныя тэхналогіі. Нашы работнікі апрацоўваюць цяпер не проста лісты, а лісты ў электронным фармаце. Падкрэслю, што ўсе гэтыя новаўвядзенні накіраваны на павышэнне аператыўнасці работы і якасці паслуг для насельніцтва. Дарэчы, яны аказаліся вельмі своечасовымі і нават жыццёва неабходнымі з пачаткам пандэміі каранавіруса.

***— Не магу не спытаць, як працавала і працуе беларуская пошта ў такіх няпростых абставінах?***

— Хачу падкрэсліць, што ў гэтых умовах пошта не спыніла сваю дзейнасць і па-ранейшаму працягвае аказваць усе неабходныя паслугі насельніцтву. Мы шукалі і знаходзілі новыя магчымасці дастаўкі паштовых адпраўленняў. Нягледзячы на тое, што закрываліся межы, усе лісты і пасылкі дастаўляліся адрасатам своечасова.

Хачу выказаць шчырую падзяку ўсяму калектыву РУП «Белпошта» за самаадданую працу падчас пандэміі. Нашым



работнікам было нялёгка, бо і яны таксама хварэлі. Многім даводзілася замяняць хворых калег, але ўся наша сістэма працавала ўстойліва і надзейна, усе паслугі аказваліся ў поўным аб'ёме.

***— Ці назіраецца сёння дэфіцыт кадраў у сістэме паштовай сувязі. Наколькі павялічыўся прэстыж такой працы?***

— Спектр паслуг, што аказваюцца сёння ў аддзяленнях паштовай сувязі, настолькі шырокі, што кожны спецыяліст павінен валодаць самымі рознымі ведамі, напрыклад, банкаўскай дзейнасці, мець адпаведную тэхнічную падрыхтоўку і гэтак далей. Трэба не проста ведаць, як адправіць ліст ці пасылку, а ўмець карыстацца сучаснымі электроннымі тэхналогіямі і сэрвісамі. Усё гэта патрабуе ад нашых супрацоўнікаў пэўнай падрыхтоўкі.

Сёння мы актыўна супрацоўнічаем з навучальнымі ўстановамі, фарміруем спецыялізаваныя студэнцкія атрады. Да нас звяртаюцца прадстаўнікі ВНУ, напрыклад, Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта з мэтай працаўладкавання студэнтаў, падпрацоўкі ў вольны час. Са свайго боку мы ахвотна ідзём насустрач, бо разумеем, што маладым людзям трэба вызначыцца з будучай прафесіяй, знайсці сваё месца ў жыцці. І таму заўсёды гатовы ўладкаваць будучых спецыялістаў у галіне паштовай сувязі. Прыемна, што сярод дзяўчат і нават юнакоў прафесія спецыяліста паштовай сувязі з кожным годам карыстаецца ўсё большай папулярнасцю, маладых людзей прыкметна больш з'яўляецца ў аддзяленнях сувязі.

Што датычыцца прафесіі паштальёна, то, павінна адзначыць, там сапраўды працуе многа людзей сярэдняга і старэйшага ўзросту. Тут яшчэ ёсць пытанні. Спецыяльнасць даволі складаная і патрабуе асаблівых якасцяў. Не кожны згодзіцца пры любым надвор'і абыходзіць свой участак абслугоўвання, цярпліва выслухоўваць і выконваць пажаданні кліентаў. Паштальёнам, лічу, можа быць толькі сапраўдны патрыёт сваёй прафесіі.

***— Як за апошні час змянілася сістэма падрыхтоўкі кадраў у галіне паштовай сувязі?***

— У апошнія гады мы зрабілі акцэнт на павышэнне ўзроўню адукацыі. Звярніце ўвагу, сёння ў аддзяленнях сувязі працуюць не проста аператары, а спецыялісты. Адпаведна, і патрабаванні пры працаўладкаванні прыкметна ўзраслі. Гэта адзначаецца ў запытах у службу занятасці, у навучальныя ўстановы. Узровень адукацыі сёння — гэта сярэдняя спецыяльная ці вышэйшая навучальная ўстанова для кіраўнікоў аддзяленняў.

Шырока распаўсюджана такая форма падрыхтоўкі персаналу, як настаўніцтва. Усіх маладых работнікаў, якія прыйшлі да нас працаваць, мы замацоўваем за вопытнымі спецыялістамі. Пагадзіцеся, што проста прыйсці і адразу авалодаць усімі тонкасцямі прафесіі нерэальна, таму падобны метад паспяхова выкарыстоўваецца ва ўсіх падраздзяленнях паштовай сувязі.

Дзеля дапамогі нашым работнікам мы распрацавалі так званую базу ведаў, дзе падрабязна распісаны ўсе нашы паслугі: якім чынам аказваюцца, якія патрабуюцца дакументы і як яны афармляюцца і г. д. Нюансаў шмат, і ўсё трэба дасканала ведаць. Кожны работнік у любы час мае магчымасць звярнуцца да гэтай базы і атрымаць адпаведны адказ на ўзніклае пытанне.

***— Заўважна, як за мінулыя гады прыемна змяніліся ўмовы абслугоўвання наведвальнікаў у паштовых аддзяленнях. А што з умовамі працы іх работнікаў?***

— Кіраўніцтва РУП «Белпошта» паставіла перад сабой задачу штогод аднаўляць каля 100—110 паштовых аддзяленняў. Уводзім новыя тэхналогіі, у тым ліку электронную чаргу, аплатныя тэрміналы, аддалены запіс, каб кліент мог прыйсці на пошту ў пэўны, зручны для яго час і атрымаць неабходную паслугу і іншае. Ва ўсіх аддзяленнях, якія абнаўляюцца, з'яўляецца падобны комплекс паслуг. Гэта, дарэчы, станоўча ацанілі нашы кліенты.

Сёння, напрыклад, кожны вясковы паштальён наведвае кліентаў і ажыццяўляе разлікі пры дапамозе мабільнага тэрмінала. Запаўненне ўсялякіх квітанцый ужо ў мінулым. Ствараецца безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Безумоўна, адначасова ўсе паштовыя аддзяленні мы не абновім, але працэс паступова ідзе ва ўсіх рэгіёнах краіны. Толькі ў Мінску сёлета будзе абноўлена 15 аддзяленняў.

Трэба адзначыць, што пры абнаўленні паштовых аддзяленняў мы клапоцімся не толькі пра кліентаў, але і пра нашых работнікаў. Ствараем для іх камфортныя ўмовы працы: аднаўляюцца сартавальныя лініі, устанаўліваюцца кандыцыянеры, закупляецца ўтульная мэбля, абсталёўваюцца месцы для прыёму ежы, куткі адпачынку і іншае. Гэта толькі збоку здаецца, што работа ў нашых спецыялістаў няцяжкая. А ўявіце сітуацыю, калі кліентаў у аддзяленні шмат, а частка работнікаў хварэе, і кожнаму даводзіцца працаваць за дваіх. А якая нагрузка выпадае на нашых супрацоўнікаў у перадсвяточныя дні, калі масава ідуць паштоўкі і пасылкі з падарункамі?!

Сваіх работнікаў мы падтрымліваем і ў сацыяльным плане. Арганізоўваецца добраахвотнае медыцынскае страхаванне, аказваецца матэрыяльная дапамога. Напрыклад, каля 40 працэнтаў работнікаў сталічных аддзяленняў паштовай сувязі ўжо скарысталіся паслугай медыцынскага страхавання. Сёння, у час пандэміі, гэта асабліва актуальна.

***— А якой вы бачыце паштовую дзейнасць у недалёкай будучыні?***

— Як кіраўніку прадпрыемства мне хацелася б, каб кожны наш кліент пакідаў паштовае аддзяленне ў добрым настроі, як кажуць, на пазітыве. А для гэтага ўсе нашы паслугі павінны аказвацца хутка і якасна. І каб кожнага наведвальніка абавязкова сустракалі з усмешкай. А яшчэ мы павінны зрабіць значны крок да бескантактавага абслугоўвання наведвальнікаў. У тым ліку і пры атрыманні пасылак.

У ідэале чалавек павінен прыйсці ў паштовае аддзяленне, і там няма ніякай чаргі. Хутка, без праблем ён вырашыць свае пытанні і не страціць асабістavailable час у чарзе. Вось якой, на мой погляд, павінна быць пошта ў будучыні. І мы паступова набліжаемся да такога варыянта аказання паштовых паслуг.

Першасная на сёння задача — поўная аўтаматызацыя працэсу апрацоўкі паштовых адпраўленняў. Гэта дазволіць паскорыць дастаўку лістоў, паштовак, пасылак адрасатам, а таксама значна палегчыць працу нашых работнікаў. Зараз мы заключаем дагавор на пастаўку падобнага вытворчага абсталявання. Удзел чалавека пры гэтым будзе мінімізаваны.

***— Святлана Віктараўна! Што б вы хацелі пажадаць работнікам РУП «Белпошта» ў дзень прафесійнага свята?***

— У першую чаргу пазітыву і аптымізму, больш прыемных падзей у жыцці, каб кожны наш супрацоўнік ішоў на працу з добрым настроем і з ім вяртаўся дадому. Каб іх заўсёды разумелі і падтрымлівалі родныя і блізкія. І, безумоўна, моцнага ўсім здароўя ў няпросты час! Шчыры дзякуй за вашу добрасумленную працу!

*Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» таксама шчыра віншуе работнікаў РУП «Белпошта» са святам і жадае ўсяго самага найлепшага!*

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## Даведачна

РУП «Белпошта» — гэта шэсць філіялаў, вытворчасць «Мінская пошта», аўтатранспартная вытворчасць. Сетка аб'ектаў паштовай сувязі налічвае 3016 аб'ектаў, з іх 1985 у сельскай мясцовасці, 170 перасоўных аддзяленняў паштовай сувязі. На прадпрыемстве працуе больш за 22 тысячы супрацоўнікаў, у тым ліку 3055 начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі, 2890 спецыялістаў па паштовай дзейнасці, 2000 аператараў паштовай сувязі.

## Са святам!

# Віншаванне міністра



**Паважаныя работнікі беларускай пошты і ветэраны паштовага сектара!**

Ад імя калегіі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і сябе асабіста віншую вас з Сусветным днём пошты!

Па традыцыі 9 кастрычніка міжнародная паштовая супольнасць адзначае важную гістарычную дату, калі ў 1874 годзе быў заснаваны Сусветны паштовы саюз.

Беларуская пошта, напоўненая слаўнай гісторыяй, годна выконвае высокую місію — падтрымлівае высакародны статус сацыяльнага партнёра дзяржавы, умацоўвае інфармацыйнае адзінства краіны, стабільнасць грамадскіх камунікацый, забяспечвае дзейнасць прадпрыемстваў і ўстаноў.

Сёння, у перыяд бурнага развіцця высокіх тэхналогій, усе работнікі паштовай супольнасці ўносяць важкі ўклад у падтрыманне станоўчага іміджу прадпрыемства. Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Белпошта» рэалізаваны шэраг праектаў, якія забяспечылі павышэнне якасці абслугоўвання як насельніцтва, так і юрыдычных асоб. Пастаянна ўкараняюцца новыя віды паслуг і паштовага сэрвісу. Так, у бягучым годзе ўведзена ў эксплуатацыю Нацыянальная паштовая электронная сістэма, якая дазваляе перасылаць лісты ў электроннай форме з захаваннем юрыдычнай значнасці факта адпраўкі і ўручэння ліста.

Ажыццяўляецца маштабаванне праекта «Мабільны паштальён», здольнага аказваць анлайн-паслугі дома ў кліентаў. На працягу найбліжэйшых гадоў будзе ажыццёўлена інтэграцыя з міжнароднымі інфармацыйнымі сістэмамі Сусветнага паштовага саюза.

Выказваю глыбокую ўпэўненасць, што намечаныя гарызонты будуць паспяхова дасягнуты, таму што ў паштовай сферы працуюць выдатныя людзі, якія душой і сэрцам прыкіпелі да няпростай і адказнай справы. Усе яны адданы сваёй нялёгкай прафесіі, перадаюць багаты вопыт, веды і сілы. Асобныя словы падзякі і адмысловая ўдзячнасць — ветэранам галіны, заснавальнікам найлепшых традыцый паштовай сувязі, жанчынам-паштавікам, якія працуюць у сельскай мясцовасці. На вашых плячах ляжыць адказная задача — словам і справай дапамагаць жыхарам беларускай глыбінкі. Дзякую вам за добрасумленную працу і надзвычайную адданасць прафесіі!

З нагоды міжнароднага прафесійнага свята віншую ўсіх работнікаў беларускай пошты і жадаю моцнага здароўя, шчасця, міру і дабрабыту!

Са святам, дарагія сябры!

**Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанцін ШУЛЬГАН.**

# ПАДПОЛЬШЧЫКІ, ПАРТЫЗАНЫ, ФРАНТАВІКІ

## «Вогненная» старонка ў стагадовай гісторыі першага беларускага ўніверсітэта

**У 1941 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт рыхтаваўся адзначыць сваё дваццацігоддзе. У маі стартавалі дзяржаўныя экзамены. 21 чэрвеня распачала работу юбілейная навуковая сесія, разгарнулася святочная выстаўка, прысвечаная дасягненням факультэтаў. Але ўсе планы перакрэсліла вайна...**

**23 чэрвеня студэнты-хімікі, нягледзячы ні на што, здалі экзамен па спецкурсе. На 24 чэрвеня было запланаванае ўручэнне дыпломаў выпускнікам, аднак Мінск пастаянна бамбілі, таму заняткі ў БДУ ў гэты дзень вырашылі часова прыпыніць. Падрыхтоўчыя курсы і завочнае аддзяленне, дзе навучалася 200 і 1500 чалавек адпаведна, былі распушчаны.**



Уладзімір Парахневіч.



Сходня, 1943 год.

### ШЫБЕНІЦА Ў ДВАРЫ

— Адразу ж пасля выступлення па радыё Молатава пачаліся стыхійныя мітынгі, на якіх асуджаўся агрэсар. Не чакаючы павестак, студэнты і выкладчыкі пайшлі ў ваенкаматы. Толькі ў першыя дні вайны ў Чырвоную армію мабілізавалі 450 чалавек, у тым ліку 50 выкладчыкаў, — расказвае **кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта БДУ Сяргей АЛЕКСАНДРОВІЧ**. — А на сёмы дзень вайны ў сталіцу БССР увайшлі нямецкія войскі. Некаторыя студэнты гістарычнага і біялагічнага факультэтаў, калі пачалася вайна, былі не ў Мінску, праходзілі практыку: гісторыкі працавалі на археалагічных раскопках у Крыме, а біёлагі — у Белавежскай пушчы. Не маючы магчымасці вярнуцца дадому, большасць з іх з'явіліся на прызыўныя пункты па месцы знаходжання і ўступілі ў Чырвоную армію.

Паколькі БДУ, як і іншыя ВНУ Мінска, эвакуіравацца не паспеў, у рукі фашыстаў трапіла ўся універсітэцкая матэрыяльная база. Універсітэцкі гарадок немцы занялі 29 чэрвеня. У яго будынках па вуліцы Савецкай размясціліся часткі СД, падвалы прыстасавалі пад турму, у двары ўстанавілі шыбеніцу. Будынак фізіка-матэматычнага корпуса заняла чыгуначная сувязь, у біялагічным корпусе спачатку знаходзіўся армейскі штаб, затым — камісарыят горада і вобласці.

Захопнікі пачалі вывозіць у Германію самае каштоўнае навуковае і вучэбнае абсталяванне, кнігі, музейныя калекцыі БДУ. Рэшткі ўніверсітэцкага абсталявання былі сабраны ў хімічным корпусе, які ўяўляў сабой «звалку ўніверсітэцкага гарадка».

На акупаванай тэрыторыі засталося каля 780 выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ. Уладкавацца па спецыяльнасці маглі толькі медыкі. Астатнія ж прадстаўнікі навуковай інтэлігенцыі былі вымушаны працаваць настаўнікамі ў школах, машыністкамі, прачкамі, прыбіральшчыкамі, чорнарабочымі. Многія так і не змаглі знайсці хоць нейкую працу.

У 1942 годзе, калі стала зразумелым, што вайна будзе зацяжной, немцы на акупаваных тэрыторыях зрабілі чарговую, прычым вельмі настойлівую спробу прыцягнуць да супрацоўніцтва навуковую інтэлігенцыю. У чэрвені 1942 года было абвешчана аб стварэнні «Беларускага навуковага таварыства», ганаровым прэзідэнтам якога стаў гаўляйтар Беларусі Вільгельм Кубэ. Аднак жаданне фашыстаў «ажывіць» пад сваім кантролем навуковае жыццё наткнулася на пасіўнасць вучоных.

### НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ... НАВУКА

Не паспеў эвакуіравацца з Мінска найстарэйшы **прафесар гістарычнага факультэта БДУ, акадэмік Мікалай НІКОЛЬСКІ**. Газета «Праўда» заказала яму артыкул, прысвечаны 20-годдзю БДУ. Якраз 22 чэрвеня раніцай ён пачаў пісаць, за гэтым заняткам і заспела яго вестка пра вайну. Мікалай Нікольскі з жонкай спрабавалі самастойна выйсці з палаючага горада, аднак былі вымушаны вярнуцца ў Мінск. У акупаваным горадзе вучоны апынуўся ў складанай сітуацыі, жыў з продажу сваіх рэчаў, галадаў, дапамагаў іншым, але ад працы на гітлераўцаў ухіляўся. Ён працягваў займацца навукай — за два гады напісаў манаграфію, якая была выдадзена ўжо пасля вайны.

— Большасць выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, якія адмовіліся супрацоўнічаць з акупантамі, прынялі актыўны ўдзел у падпольнай рабоце, — расказвае Сяргей Александровіч. — У 1941 годзе ў Мінску і яго наваколлі дзейнічала больш за 50 падпольных груп, у 1942 годзе — ужо 100. Мікалай Нікольскі прыгадваў: «Сярод маіх выпускніц па БДУ была адна мінчанка, якая перад вайной ужо чытала лекцыі па гісторыі ВКП(б) на гістфаку педагагічнага інстытута, звалі яе Маша... Яна была ўцягнута ў партызанскую работу, працягвала сувязной. Яна ж і вывезла ўсю маю сям'ю з Мінска». Дзякуючы **падпольшчыцы Марыі МАЛАКОВІЧ** прафесар трапіў у жніўні 1943 года ў размяшчэнне брыгады «За Савецкую Беларусь». Але адправіць акадэміка на Вялікую зямлю хутка не атрымалася. Вучоны, які не вылучаўся добрым здароўем, выпрабаваў усе нягоды партызанскага побыту. Пры гэтым ён не пераставаў працаваць. У партызанскім атрадзе Мікалай Міхайлавіч перапісаў і адрэдагаваў тэкст сваёй манаграфіі, на вокладцы якой напісаў: «Пачата збіранне матэрыялаў 12.IX.1941, пачата напісанне тэксту 16.II.1942, скончана 18.III.1943 у акупаваным Мінску, у гонар Савецкай Радзімы. Канчаткова адрэдагавана і перапісана да 14.XII.1943 у партызанскіх атрадах Беларусі. У выпадку, калі я не дажыву да радаснай сустрэчы з Вялікай зямлёй, прашу маіх таварышаў па партызанскай зоне прыняць усе меры па дастаўцы гэтага рукапісу ў Маскву, у Акадэмію навук».

### УЗНАГАРОДА — 3 ТЫСЯЧЫ МАРАК

Былая студэнтка Нікольскага Марыя Малаковіч перапраўляла з Мінска ў партызанскія атрады некалькі груп савецкіх грамадзян, у тым ліку і прафесараў БДУ Прыляжаева і Вятохіна, якія ўваходзілі ў групу Клумава. Марыя Фёдараўна вяла актыўную агітацыйна-прапагандысцкую работу, кіравала зборам для партызан армейскага абмундзіравання, зброі, звестак аб размяшчэнні нямецкіх войскаў. Напрыканцы 1943 года была схоплена і загінула ў засценках гестапа.

**Студэнтка другога курса геаграфічнага факультэта Ніна АБРАМОВІЧ** стварыла падпольную групу са сваіх аднакурснікаў. Яе ўдзельнікі ўладкаваліся працаваць на нафтабазу і перадавалі інфармацыю партызанам і падпольшчыкам. Члены групы былі раскрыты і арыштаваны. Сама Ніна памерла ў канцэнтрацыйным лагеры Асвенцім.

Супрацоўнічала з мінскім падполлем і **Ніна ЛІСАВЕЦ**, якая таксама да вайны навучалася на геаграфічным факультэце. У студзені 1944 года яе арыштавалі і адправілі ў канцэнтрацыйны лагер, а затым — на жалезныя руднікі ў Францыю. У маі яна змагла збегчы адтуль разам з іншымі вязнямі і ўзначаліла жаночы партызанскі атрад «Радзіма», які дзейнічаў на тэрыторыі гэтай краіны. За баявыя заслугі беларусцы было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

Студэнты і выпускнікі БДУ ўдзельнічалі ў арганізацыі падполля і ў іншых беларускіх гарадах. Так, **студэнтка філфака Вара ВЫРВІЧ** з'яўлялася сакратаром Добрушскага падпольнага райкама ЛКСМБ. За яе затрыманне камендант Добруша абяцаў тры тысячы марак, пяць пудоў солі і надзел зямлі.

### ЭШАЛОНЫ ПАД АДХОН

Героем Савецкага Саюза стаў **выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта БДУ Уладзімір ПАРАХНЕВІЧ**. Спачатку ён уваходзіў у групу бабруйскага падполля, затым перайшоў у партызанскі атрад, дзе ўзначаліў дыверсійную групу, займаўся знішчэннем нямецкіх эшалонаў. Пры яго асабістым удзеле падрыўнікі пусцілі пад адхон на ўчастку чыгункі Бабруйск — Жлобін 21 варожы састаў.

Аднойчы Парахневічу давялося, седзячы вярхом на 50-кілаграмовай бомбе, якая не разарвалася і праляжала паўтара года ў зямлі, здабываць каштоўны для партызан тол для фугасаў. Кожны ўдар мог стаць апошнім... Вясной 1943 года, падчас аперацыі на чыгунцы, былі параненыя два падрыўнікі. Цэлым застаўся толькі Уладзімір Парахневіч. І ён змог, нягледзячы на фашысцкія патрулі і вясновае бездарожжа, на падводзе пераадолець 80-кіламетровы шлях за некалькі дзён і даставіць параненых у атрад.

З лістапада 1943 года Уладзімір Парахневіч быў палітруком роты 539-га атрада 9-й партызанскай брыгады імя Кірава. Званне Героя Савецкага Саюза Уладзіміру Аляксеевічу было прысвоена 15 жніўня 1944 года. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ён знаходзіўся на камсамольскай і педагагічнай рабоце ў Мінску. Займаў пасаду дырэктара СШ № 21. Быў удастоены звання «Заслужаны настаўнік БССР». Яго імем названая вуліца ў Мінску.

**Міхаіл КАТЛАВЕЦ** — выпускнік БДУ 1937 года. У Чырвонай арміі — з 1938 года. У 1941 годзе закончыў курсы малодшых лейтэнантаў пры Харкаўскім танкавым вучылішчы. Ваяваў на розных франтах, удзельнічаў у Сталінградскай бітве, у вызваленні Украіны і Малдовы, Румыніі і Балгарыі. Камандзір танкавага батальёна капітан Міхаіл Катлавец вызначыўся 7 студзеня 1944 года ў баі за чыгуначную станцыю Лелякоўка (на захад ад Кіраваграда), дзе знішчыў сем танкаў і адбіў шэсць контратак праціўніка. Падчас прарыву варожай абароны на румына-венгерскай граніцы 5 кастрычніка 1944 года яго батальён знішчыў пяць гармат, больш як 100 павозак з боепрыпасамі, узяў у палон 130 гітлераўцаў. У наступным баі 6 кастрычніка Міхаіл Катлавец загінуў. А 24 сакавіка 1945 года яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён пахаваны ў малдаўскім горадзе Цірaспалі ў брацкай магіле. Яго імем названы вуліцы ў Цірaспалі, Мазыры і вёсцы Лешня Мазырскага раёна.

**З ліку студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ — удзельнікаў вайны — дванаццаці было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.** Сіламі студэнцкіх атрадаў і на сродкі, заробленыя студэнтамі, на тэрыторыі ўніверсітэта ў 1970-х гадах быў узведзены мемарыяльны знак у гонар тых, хто не вярнуўся з Вялікай Айчыннай вайны. Ён уяўляе сабой значок-ромбік, які не паспелі атрымаць выпускнікі БДУ, рассечаны пасярэдзіне контурамі вінтоўкі. На знаку можна прачытаць наступныя словы: «Светлай памяці тых, хто з роднага ўніверсітэта пайшлі на свяшчэнную бітву з фашызмам і смерцю герояў палеглі ў бітве, каб вечна свяціла над нашай Радзімай сонца свабоды».

### «ШПАРГАЛКІ — ГЭТА ЗДРАДА!»

Расказваючы пра ваеннае мінулае БДУ, нельга абмінуць увагай аднаўленне яго дзейнасці ў 1943 годзе пад Масквой. Апошняга рэктара Парфена Пятровіча Савіцкага, які паспеў эвакуіравацца з Мінска і працаваў на той момант дырэктарам педагагічнага інстытута ў Ніжнім Тагіле, выклікалі ў Маскву і ў лютым 1943 года аднавілі на ранейшай пасадзе. Некаторыя факультэты і курсы БДУ размясціліся ў будынках Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. А галоўны навучальны корпус — у памяшканні сярэдняй школы на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі. Выкладчыкі і студэнты пасяліліся ў 40 дачных домiках на гэтай жа станцыі. МДУ і іншыя маскоўскія ВНУ перадалі Беларускаму ўніверсітэту навучальнае і навуковае абсталяванне, падручнікі і дапаможнікі. Так, толькі МДУ вылучыў 18 тысяч тамоў рознай літаратуры. Да канца ліпеня 1943 года ўрад БССР устанавіў сувязь з 25 прафесарамі, 55 дацэнтамі, 24 старшымі выкладчыкамі з Беларусі. З іх на пасады ў БДУ папярэдне запрасілі 65 чалавек. Некаторых выкладчыкаў адклікалі з дзеючай арміі. З партызанскіх атрадаў пераправілі акадэміка Мікалая Нікольскага, прафесараў Івана Андрэевіча Вятохіна і Мікалая Аляксандравіча Прыляжаева. Ваенную справу студэнтам выкладаў франтавік, будучы вядомы пісьменнік Іван Мележ, які працу спалучаў з вучобай.

Паведамленне аб аднаўленні дзейнасці БДУ было апублікавана ў «Праўдзе» і ў «Настаўніцкай газеце», а таксама ў мясцовым друку. Ад ахвотных вучыцца паступіла больш чым 1380 заяў. У выніку атрымалася зрабіць набор на першы курс усіх шасці даваенных факультэтаў. Усяго залічылі 562 чалавекі: сярод іх былі і ранейшыя студэнты БДУ, якія паспелі эвакуіравацца, і дэмабілізаваныя па раненні або хваробе, а таксама маладыя людзі, якія скончылі сярэднюю школу ўжо падчас вайны.

Вучыліся студэнты добрасумленна. Не хапала паперы, замест яе выкарыстоўваліся газеты, шпалеры, канцылярскія кнігі. Студэнтка хімфака ўспаміала: «Шпаргалак не ведалі. Гэта было б здрадай перад ваюючымі аднагодкамі, якія гінулі». І выкладчыкі, і студэнты, акрамя сваіх непасрэдных абавязкаў, займаліся добраўпарадкаваннем жылля, перавозкай універсітэцкай маёмасці, працавалі ў канцылярыях і бібліятэках. Кожны студэнт адпрацоўваў адзін дзень у лесе, нарыхтоўваючы дровы для кухні. Акрамя таго, студэнты і выкладчыкі збіралі падарункі для савецкіх салдат і беларускіх партызан, а таксама грошы на авіяэскадрыллю «Вызваленая Беларусь», танкавую калону «За Савецкую Беларусь!». Некаторыя здавалі кроў для параненых байцоў Чырвонай арміі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота з архіва Музея гісторыі БДУ.**

# СТРЭС-ТЭСТ ДЛЯ СТАРОГА СВЕТУ

## ЧАМУ ЕЎРОПУ АХАПІЎ ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КРЫЗІС?

**На гэтым тыдні ўвесь свет назіраў неверагоднае газавае «ралі». Кошт блакітнага паліва ўшчыльную наблізіўся да 2000 долараў за тысячу «кубоў». Значэнне стала найвышэйшым за ўвесь час назіранняў. Пра гэта сведчаць даныя лонданскай біржы ICE. Праўда, пасля расцэнкі абваліліся больш чым удвая — да 1000 долараў за «куб» і ніжэй. Як вядома, газ у Еўропе імкліва даражэе з сярэдзіны жніўня і за мінулы час вырас у цане больш чым на 200 працэнтаў. Такія ваганні ў расцэнках на адзін з асноўных энерганосьбітаў асабліва небяспечныя напярэдадні халадоў, тым больш ва ўмовах недахвату блакітнага паліва ў сховішчах. Чаму Еўропу ахапіў энергетычны крызіс, чаго чакаць надалей?**

### ПОПЫТ НА МАКСІМУМЕ

Еўракамісія (ЕК) лічыць прычынай энергетычнага крызісу ў ЕС неспрыяльныя рынкавыя ўмовы, калі попыт на энергарэсурсы дасягнуў максімуму за 25 гадоў. Пра гэта заявіў намеснік старшыні Еўракамісіі Франс Тымерманс, прыбыўшы на пасяджэнне Савета ЕС па экалогіі, паведаміла ТАСС. «Уся справа ў рынкавых умовах. Попыт на энергарэсурсы сёння дасягнуў максімальных паказчыкаў за апошнія 25 гадоў, што і стварае пікі цэн», — заўважыў еўрачыноўнік.

**У апошнія гады ЕС актыўна закрываў вугальныя ЦЭЦ і атамныя электрастанцыі, разлічваючы на тое, што аднаўляльныя крыніцы энергіі (АКЭ) будуць усё больш замяняць вуглевадароднае паліва. Між тым наяўных магутнасцяў АКЭ не хапае, а праблему рэзка ўзрослага попыту можна вырашыць толькі за кошт выкарыстання традыцыйнай энергасыравіны.**

Ён таксама пастараўся мінімізаваць ролю створанай Еўракамісіяй сістэмы гандлю квотамі на выкіды парніковых газаў ва ўзнікненні крызісу. «Гэтая сістэма паўплывала ў вельмі нязначнай меры, толькі на ўзроўні адной пятай. Праблема знаходзіцца ў іншым месцы, у рынкавых умовах», — перакананы ён. Намеснік старшыні ЕК адхіліў здагадку журналістаў, што энергетычны крызіс прымусіць ЕС часова адступіць ад сваіх кліматычных задач. «Гэта выключана, кліматычныя нормы ЕС высечаны ў камені», — заявіў Франс Тымерманс.

Пры гэтым старшыня Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен заявіла, што Еўракамісія мае намер у доўгатэрміновай перспектыве павышаць інвестыцыі ў зялёную энергетыку ў адказ на энергакрызіс у Еўропе. «Мы павінны заўсёды падкрэсліваць, што, пакуль цэны на газ узлятаюць уверх, цэны на аднаўляльныя крыніцы энергіі за апошнія гады некалькі знізіліся і застаюцца стабільнымі, таму ў доўгатэрміновай перспектыве нам неабходна інвеставаць у аднаўляльную энергію, якую ЕС вырабляе самастойна», — заўважыла яна, дадаўшы, што Еўракамісія на наступным тыдні прадставіць прапановы па рэагаванні на энергетычны крызіс у Еўропе.

Як вядома, Еўракамісія на працягу апошніх 10 гадоў працавала над стварэннем у ЕС свабоднага рынку газу і электрычнасці, сцвярджаючы, што паралельна з паўсюдным укараненнем зялёнай энергетыкі (якая пакуль выраблае больш дарагую электрычнасць у параўнанні з вугляроднай) гэта ў канчатковым выніку прывядзе да зніжэння цэн на энергію ў Еўропе.

### РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

У той жа час наяўных у рэгіёне запасаў газу ўжо не хапае для таго, каб цалкам забяспечыць бягучыя патрэбы еўрапейскіх спажыўцоў. Пра гэта rt.com распавёў аналітык ФГ «Фінам» Аляксей Коранеў. Паводле яго слоў, значны аб'ём палівых рэзерваў быў выдаткаваны яшчэ падчас папярэдняй зімы, калі з-за халадоў рэзка вырас попыт, і ўлетку — у сувязі з гарачым надвор'ем і ўзрослым энергаспажываннем на кандыцыяніраванне.



Акрамя таго, як адзначыў эксперт, Еўропа засталася і без амерыканскага звадкаванага прыроднага газу (ЗПГ). У верасні па прычыне ўраганаў і штармоў кампаніям у ЗША прыйшлося на час прыпыніць здабычу энергасыравіны ў Мексіканскім заліве, што прывяло да затрымак паставак. Хоць цяпер сітуацыя паступова стабілізуецца і большасць вытворчасцяў зноў запрацавала, Штаты не спяшаюцца адпраўляць газ у Еўропу. «Мы бачым, што вельмі актыўна да наступстваў пандэміі аднаўляецца Кітай і ўвесь Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён. Сёння гэта галоўныя спажыўцы газу, якія гатовыя купляць энергасыравіну па больш высокай цане. Таму частка амерыканскага газу ідзе не ў Еўропу, а менавіта ў Азію», — заўважыў эксперт.

Зараз сховішчы краін Еўрасаюза і Вялікабрытаніі сумарна запоўненыя прыкладна на 76 працэнтаў, хоць яшчэ год таму гэта значэнне складала каля 95 %. Найменшыя запасы газу ў Германіі (69,3 %), Швецыі (66,4 %), Нідэрландах (58,5 %), Аўстрыі (54,8 %) і Партугаліі (52 %).Такія лічбы агучыла напярэдадні Асацыяцыя газавай інфраструктуры Еўропы (GIE). «У прынцыпе, бягучых узроўняў запасаў будзе дастаткова, калі зіма акажацца мяккай, прыкладна як у нас цяпер восень. Аднак у выпадку наступлення сур'ёзных халадоў запаўняльнасць сховішчаў павінна быць не меншая чым 86—90 %. Гэтыя аб'ёмы трэба недзе купіць», — падкрэсліў Аляксей Коранеў.

Цікава, што ў бягучай сітуацыі пяць краін Еўрапейскага саюза — Францыя, Іспанія, Грэцыя, Румынія і Чэхія — заклікалі правесці расследаванне для вызначэння сапраўднай прычыны росту цэн на газ. Пра гэта гаворыцца ў сумеснай заяве міністраў эканомікі і фінансаў гэтых дзяржаў. «Што датычыцца газу, неабходна правесці вывучэнне работы еўрапейскага газавага рынку з той мэтай, каб высветліць, чаму дзеючых газавых кантрактаў аказалася недастаткова. Нам варта таксама сфармуляваць агульныя кіруючыя прынцыпы па захоўванні газу з мэтай змякчыць і згладзіць павышэнне цэн», — адзначаецца ў дакуменце.




Зрэшты, у Еўрасаюзе мяркуюць, што ажыятажны рост цэн на газ мог быць выкліканы ў тым ліку памылкамі самой Еўракамісіі. З такой заявай выступіў прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан. «Еўрасаюз павінен адкарэкціраваць сваю палітыку. Мы павінны змяніць некаторыя зялёныя нормы, інакш усе будуць пакутаваць», — перакананы кіраўнік венгерскага ўрада. Як адзначыў rt.com кіраўнік аналітычнага дэпартамента AMarkets Арцём Дзееў, захады еўрапейскіх улад прывялі да перакосу ў зялёнай палітыцы рэгіёна. Так, у апошнія гады ЕС актыўна закрываў вугальныя ЦЭЦ і атамныя электрастанцыі, разлічваючы на тое, што аднаўляльныя крыніцы энергіі (АКЭ) будуць усё больш замяняць вуглевадароднае паліва. Між тым наяўных магутнасцяў АКЭ не хапае, а праблему рэзка ўзрослага попыту можна вырашыць толькі за кошт выкарыстання традыцыйнай энергасыравіны, патлумачыў аналітык. «На гэтым фоне ў Еўропе ўжо пачалі руйнавацца энергетычныя кампаніі. Гэта пагражае далейшымі праблемамі ў сектары і ростам цэн. Паколькі ўклад энергарэсурсаў у вытворчасць абсалютна ўсіх тавараў — ад прадуктаў харчавання да аўтамабіляў — даволі высокі, праз нейкі час ЕС сутыкнецца з сур'ёзным разгонам інфляцыі», — адзначыў Арцём Дзееў.

### ХТО НАДЗІМАЕ БУРБАЛКУ?

Дадатковым ударам па еўрапейскім энергарынку стала рэгуляванне Еўракамісіяй цэнаўтварэння на паліва, лічыць Аляксей Коранеў. Як адзначыў аналітык, раней ЕС настаяў на тым, каб купля газу ажыццяўлялася не на падставе доўгатэрміновых кантрактаў з прывязкай да кошту нафты, а па біржавым прынцыпе. «Цяпер жа мы бачым тыповую біржавую паніку. Гэта страшная рэч, бо на біржы велізарная колькасць спекулянтаў, якія спрабуюць нагрэць рукі на тых, хто кідаецца і гатовы купляць газ па любой цане», — адзначыў эксперт.

Дырэктар Фонду энергетычнага развіцця і эксперт па энергетыцы Сяргей Пікін назваў сітуацыю з ростам цэн на газавай біржы надзіманнем бурбалкі, паведаміла lenta.ru. Паводле яго слоў, гэта адбываецца з-за таго, што цэны на рынку даўно адарваліся ад тавару. Цана за кубаметр звадкаванага газу, якая перавышае планку ў тысячу долараў, вызначаецца арбітражам паміж Азіяй і Еўропай, адзначыў Пікін. «Гэта значыць, які рэгіён дасць вышэй цану, туды звадкаваны газ і пойдзе. Газ, які ідзе па трубах, гэта канстанта, нязменная велічыня, гэтыя аб'ёмы не змяняюцца. Яны зменяцца тады, калі будзе ўвядзены «Паўночны паток — 2» і еўрапейцы атрымаюць новыя аб'ёмы газу і цана знізіцца. Пакуль няма «Паўночнага патоку — 2», еўрапейцы з азіятамі канкуруюць за пастаўкі звадкаванага газу, якога ў свеце таксама фіксаваныя аб'ёмы, новага не з'яўляецца. Таму, хто дае больш высокую цану, туды газ і ідзе», — растлумачыў эксперт.



Па словах Сяргея Пікіна, такая бурная рэакцыя на рынках адбываецца з-за таго, што яны даўно адарваліся ад тавару. На яго думку, сітуацыя з ростам цэн на звадкаваны газ будзе працягвацца. Еўрапейцам, падкрэсліў Пікін, неабходна запоўніць свае аб'ёмы сховішчаў да пачатку ацяпляльнага сезона, а азіяцкі рынак гатовы закупляць газ па любой цане.

### ЗІМА СПЫТАЕ

Аналітыкі мяркуюць, што рост цэн працягнецца. Кошт газу ў Еўропе можа падняцца значна вышэй за дзве тысячы долараў за тысячу кубаметраў у выпадку халоднай зімы і захавання паставак паліва на бягучым узроўні. Аб гэтым РІА «Навіны» заявіў кіраўнік аддзела стратэгій на таварна-сыравінным рынку Saxo Bank Оле Ханс.

Паводле прагнозаў кліматолагаў, беспрэцэдэнтна суровая зіма ў Паўночным паўшар'і справакуе хаос і паніку на энергетычным і харчовым рынках. У прыватнасці, жыхары большасці краін Еўропы ўжо атрымліваюць вялікія рахункі за ацяпленне сваіх дамоў і кватэр. Пра гэта паведаміла Bloomberg.

Калі зіма сапраўды будзе адпавядаць прагнозам кліматолагаў, сумы за ацяпленне і ўвогуле стануць астранамічныя. Сіноптыкі прагназуюць, што ваганне тэмпературы павярхоўнага пласта вады ў экватарыяльнай частцы Ціхага акіяна Эль-Ніньё прынясе ўстойлівы халодны фронт на тэрыторыю Паўночнага паўшар'я і пацапленне на поўдзень ЗША, а таксама выкліча засуху на большай частцы планеты.

Пры гэтым палярны віхор, які вызначае ўзровень ціску на Паўночным полюсе, у гэтым годзе будзе слабейшы, чым у мінулым. Гэта, па меркаванні кліматолагаў, абернецца тым, што будучай зімой халоднае арктычнае паветра найбольш верагодна будзе рэгулярна перамяшчацца ў рэгіён Азіі, Паўночнай Амерыкі і Еўропы, несучы з сабой суровыя пахаладанні.

Паводле даных Goldman Sachs Group, ёсць рызыка адключэння электраэнергіі гэтай зімой. Асабліва калі маразы пагоршаць і без таго выключна нізкія запасы газу ў Еўропе, паведаміла Bloomberg. Дэфіцыт блакітнага паліва пагражае Старому свету ростам цэн і перабоямі з харчаваннем, заўважыла «Бі-бі-сі». Еўрапейскі энергетычны крызіс ударыць па індустрыі ўгнаенняў, што паставіла пад пагрозу забеспячэнне прадуктамі. Як паведамляе Bloomberg, скарачэнне паставак харчавання прывядзе да скачка цэн на ежу.

На рэзкі рост кошту прадуктаў паўплывалі не толькі ўзрослыя расцэнкі на электраэнергію, але і павелічэнне выдаткаў з-за экстрэмальных умоў надвор'я і пандэміі. Затраты на транспарціроўку працягваюць расці, а перабоі ў ланцужках паставак па-ранейшаму адбываюцца з-за лакальных лакдаўнаў. Ураган Іда і шторм Нікалас таксама нанеслі сур'ёзны ўрон сельскай гаспадарцы. Паводле звестак Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО), цэны на прадукты харчавання дасягнулі рэкорднага ўзроўню за апошнія 60 гадоў. Асабліва моцна інфляцыя ўдарыла па найбольш бедных краінах, якія залежаць ад імпарту.

**Захар БУРАК.**

# ЮНАК ПАЙШОЎ У ДЭКРЭТНЫ АДПАЧЫНАК...

## Цяпер гэта сапраўды магчыма

**За мінулы час у нашым тандэме змен не адбылося. Сталага журналіста Сяргея КУРКАЧА заганяе ў кут сваімі дзёрзкімі разважаннямі журналіст-пачатковец Лізавета ТАНАНА. Лізавета вельмі здзівілася расповеду Сяргея, што яго жонка большую частку сямейнага жыцця правяла ў дэкрэце, а потым і зусім не працавала, усю сябе прысвяціла дзецям. Сучасных жа дзяўчат такая перспектыва зусім не вабіць. Тая ж Лізавета прытрымліваецца думкі, што калі адшукае высокааплатную работу, то пры нараджэнні дзіцяці адправіць у дэкрэт свайго мужа.**







### НА БОГА СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ І САМ СТАРАЙСЯ

**Сяргей:** Ліза, дзіцятка, дзе ж ты такога мужа знойдзеш, які сваё мужчынскае эга прамяняе на пялёнкі і распашонкі?

**Лізавета:** Калі я буду зарабляць больш, то, думаю, выбіраць не прыйдзецца. Сучасная моладзь грошы лічыць умее не горш за вас. Да таго ж я яму дапамагаць буду. Увогуле, сыграю ролю стэрэатыпнага бацькі.

**Сяргей:** А ці не страціце вы ў гэтым выпадку дапамогу на дзіця?

**Лізавета:** Не, дапамогу ў нашай краіне выплачваюць незалежна ад таго, хто з бацькоў выходзіць у дэкрэт. Цяпер гэта дапамога складае 495,74 рубля за адно дзіця, а калі двое і больш — 566,56 рубля. А яшчэ пры нараджэнні дзіцяці выдаецца аднаразовая выплата ў памеры 10 БПМ — цяпер гэтая сума 2834,6 рубля, і выплачваецца яна незалежна ад таго, хто з бацькоў застаецца ў дэкрэтным адпачынку. Адзіная ўмова атрымання гэтай выплаты — жанчына павінна стаць на ўлік цяжарнасці на тэрміне да 12 тыдняў ва ўчастковую бальніцу.

**Сяргей:** Раю табе, Ліза, усё ж такі не надта спадзявацца на дзяржаву. Грошыкі табе дадуць, але ж не адразу, а толькі тады, калі зарэгіструеш дзіця ў ЗАГСе. Таму, на маю думку, мужчына і жанчына самастойна павінны падрыхтавацца да прадаўжэння роду. Нядрэнна было б назапасіць якую тысячу долараў. Гэта могуць быць грошы, якія на вяселле падаравалі. Ды і вам цяпер больш варушыцца трэба, каб зарабляць не толькі на сябе. А вось табе мая галоўная практычная парада: нараджай адразу тройню! Атрымаеш статус шматдзетнай маці, у гарвыканкаме цябе запішуць на асобны жыллёвы ўлік, дадуць ільготны крэдыт. Тады сваю кватэрную праблему цалкам закрыеш. Гэта я пра глабальнае...

**Лізавета:** Так, згодная з вамі, збіраць сапраўды неабходна, ды і наогул да з'яўлення дзіцяці трэба рыхтавацца грунтоўна.

### МУЖЧЫНА ЎСЁ РОЎНА АТРЫМЛІВАЕ БОЛЬШ. АЛЕ НЕ ЗАЎСЁДЫ

**Сяргей:** У маім юнацтве (30 гадоў таму) гэтую тэму нават не ўзнімалі. Здабытчыкам, галавой сям'і быў менавіта мужчына. Ты хочаш сказаць, што за такі кароткі тэрмін змянілася грамадскае меркаванне і мужчына стаў менш мужным і адказным?

**Лізавета:** Памянялася не грамадскае меркаванне, а стаўленне да яго. Цяпер грамадская думка не вызначае жыццё, людзі не звяртаюць на яе ўвагу і жывуць так, як ім зручна, не азіраючыся на тое, што скажуць.

**Сяргей:** А калі твае блізкія людзі будуць супраць, ты што, да іх меркавання не прыслухаешся?

**Лізавета:** Не ім жа жыць маё жыццё, я буду рабіць так, як лепш мне.

**Сяргей:** Вось вы, Лізавета, грошы лічыць умееце, а мужчына пры адной і той жа кваліфікацыі ў параўнанні з жанчынай рэальна вялікія грошы зарабляе. Як жа быць з гэтым момантам?

**Лізавета:** Па статыстыцы можа і так, а вось у журналістыцы я б так не сказала. Тут усё залежыць ад таго, колькі ты напішаш і колькі захочаш зрабіць.

А так, сапраўды, у Беларусі сярэдняя заробкі мужчыны і жанчыны адрозніваюцца. Сярэдні заробак мужчыны ў Беларусі больш чым на 25 % вышэйшы, чым у жанчыны. Толькі вось сярод працоўных жанчын большы працэнт з закончанай вышэйшай адукацыяй, чым такі ж паказчык сярод працоўных мужчын. У асноўным заробкі мужчыны і жанчыны так адрозніваюцца з-за спіса забароненых прафесій для жанчын (на дадзены момант іх 181) і з-за таго, што жанчыны па статыстыцы часцей, чым мужчыны, сыходзяць у дэкрэт і з-за дзіцяці пасля ім патрэбен гнуткі працоўны графік або няпоўная стаўка. Калі жанчыны перастануць сыходзіць у дэкрэтны адпачынак, думаю, карціна вельмі хутка зменіцца.

**Сяргей:** Дапусцім, пераканала. Можа, ты лічыш, што паўнавартасна хатнюю гаспадарку мужчына можа весці лепш, чым жанчына? Нават у дзяцінстве дзяўчаткі гуляюць у лялечкі, дзе рыхтуюцца быць мамамі, а хлопчыкі ў іншыя гульні гуляюць.

**Лізавета:** Наогул, мужчына такі ж паўнавартасны бацька, як жанчына-маці, і яму сваё дзіця даглядаць не павінна скласці праблем.

### ЧОРТ ЧОРТА ПАЗНАЎ, ДЫЙ НА ПІВА ПАЗВАЎ

**Сяргей:** Ты ж разумееш, што для яго гэта дастаткова сур'ёзны крок — узваліць на сябе абавязкі мамы і хатняй гаспадыні. Цяпер ён не зможа па пятніцах схадзіць у бар на піва, у суботу і ў аўторак схадзіць у «качалку» — пазаймацца спортам. Наогул, ён павінен усяго сябе пакласці на алтар сямейнага жыцця. Ты што, сапраўды хочаш, каб твой мужчына «абабіўся»?

**Лізавета:** Вось гэта вы, канешне, сексіст... Хіба што ў жанчыны ніякіх спраў акрамя хатняй гаспадаркі не існуе. А ўспомніце, як самі распавядалі, што пасля нараджэння старэйшанькай тры гады кожны вечар хадзілі да прыватнікаў па казінае малако, таму што ў жонкі малако прапала? Вы цэлыя тры гады піва па вечарах не пілі, напэўна ж, і нічога, не прапалі, не «абабіліся»? А наогул, мой малады чалавек піва не п'е і па барах не ходзіць. Вось з «качалкай» так, трэніруецца, але, я думаю, ён можа і па вечарах трэніравацца, калі я буду вяртацца з працы.

**Сяргей:** Ну так, зноў ты маеш рацыю. Я тут успомніў, як мы сваю першую дачку з жонкай купалі. У мяне нават лепш атрымлівалася, ды так, што жонка гэты абавязак за мной і пакінула.

А ведаеш, як мы, мужчыны, «шопіцца» недалюбліваем? Я калі з жонкай у краму іду, больш за 15 хвілін знаходзіцца побач не магу. А тут усё самому прыйдзецца купляць, нават страшна неяк.

**Лізавета:** Не бачу ў гэтым нічога такога. Мужчыну, наадварот, лягчэй будзе несці цяжкія сумкі. Дарэчы, пра спіс пакупак. Думаю, вам цікава даведацца, колькі зараз сярэдні спажывецкі кошык на дзіця. А я вам раскажу. Самая танная дзіцячая сумесь — 4–5 рублёў за пачак, а тая, што даражэйшая і лепшая, — 20—40 рублёў. У сярэднім толькі на сумесі ў месяц сыходзіць ад 80 да 160 рублёў. А калі яшчэ ўводзіць прыкорм, то рублёў 60 дадаць трэба. Дзеці растуць як грыбы пасля дажджу, ім практычна кожны месяц неабходна купляць вопратку. І калі летняе адзенне ў сярэднім таннейшае, то за зімовае трэба аддаць прыстойна. Адзін дзіцячы зімовы камбінезон абыдзецца ў 100—120 рублёў, боцікі — каля 100. Ды і астатняе адзенне па цане амаль як на дарослага будзе. Дзіцячыя сліпы — ад 30 рублёў, сукенка на дзяўчынку — ад 60, легінсы, трыкатажныя джэмперы — ад 25. А вы хоць уяўляеце, колькі зараз каштуюць падгузкі? Самыя танныя — 20 рублёў за 40 штук. І такой колькасці хопіць ад сілы на 20 дзён. Тыя, што даражэйшыя, — 30—40 рублёў за ўпакоўку, вось і выходзіць у месяц ад 30 да 60 рублёў. Гэта я яшчэ не кажу, што да нараджэння дзіцяці трэба купіць усяго — каляску, ложачак... Новая каляска, дарэчы, абыдзецца рублёў у 700.

### ГАСПАДАРКУ ВЕСЦІ — НЕ ЛАПЦІ ПЛЕСЦІ

**Сяргей:** А цяпер я па тваёй канцэпцыі з цяжкай артылерыі бабахну. Я, напрыклад, ні аднаго маладога чалавека не ведаю, які б без прымусу стаў бы посуд мыць, каструлі, патэльні драіць, і анучу для падлогі ў рукі браць часцей чым раз на тыдзень з моцнага полу мала хто захоча.

**Лізавета:** А хто сказаў, што жанчыны з задавальненнем усё гэта робяць? І наогул, вы адсталі ад жыцця. Можна купіць пасудамыйную машыну і робат-пыласос. Адзін раз патраціцца на гэтыя выгоды — і потым усё жыццё адпачываць ад руціны. Пасудамыйную машыну цяпер можна ў сярэднім за 1000 рублёў купіць, а якую-небудзь круцейшую — за 1500 долараў з устаноўкай. А робат-пыласос — рублёў за 500. Вы, Сяргей Андрэевіч, яшчэ скажаце, што мужчыны гатаваць не любяць. Мой малады чалавек гатуе лепш, чым я, напрыклад. Усё што заўгодна можа прыгатаваць, для яго гэта не праблема. А тата мой сваю фірмовую кулябяку робіць. І наогул, ёсць жа мультыварка, а ў ёй зможа гатаваць нават дзіця.

**Сяргей:** Ведаю такую, але ў мяне яе няма.

**Лізавета:** Маглі б і купіць сваёй жонцы, каб палегчыць ёй жыццё. Дарэчы, сярэдняя мультыварка абыдзецца ў рублёў 200, не так ужо і дорага для камфорту.

**Сяргей:** Ты што, Ліза, хочаш сказаць, што ты са сваім маладым чалавекам да замужжа гэтую тэму ўзнімаць будзеш? Не баішся «спудзіць»?

**Лізавета:** Вядома, буду і ўжо нават падымала. Пакуль што нашы меркаванні ў гэтым пытанні сыходзяцца: хто будзе больш зарабляць, той і застаецца на працы, а другі сыходзіць у дэкрэт. Ды і наогул, на працы могуць застацца абое, і пры гэтым дэкрэтныя грошы ўсё роўна будуць выплачвацца. Бачу, вы здзівіліся. У нашай краіне памер дапамогі скарачаецца напалову, калі мама (ці тата) працуе па грамадзянска-прававым дагаворы; зарэгістраваная як індывідуальны прадпрымальнік, рамеснік або адвакат; навучаецца ў ардынатуры ў вочнай форме і атрымлівае стыпендыю; працуе больш чым на паўстаўкі; зарэгістраваная ў якасці ўладальніка маёмасці юрыдычнай асобы.

**Сяргей:** А калі твой малады чалавек трошкі не будзе спраўляцца, давядзецца табе кідаць працу і ісці на дапамогу.

**Лізавета:** Вы забыліся, Сяргей Андрэевіч, я грошы зарабляю. А на гэтыя грошы магу і няньку наняць. Зараз гэта ў гарадах распаўсюджаная практыка, у іх ва ўсіх адукацыя ёсць, і яны могуць дапамагчы ў выпадку нейкіх праблем. У сярэднім за паслугі няньці трэба аддаць ад 8 да 12 рублёў у гадзіну, калі дзяцей двое — то ад 12 да 16. А калі наняць няньку на ўмовах пражывання, то ў месяц прыйдзецца аддаць ад 1600 рублёў. Але калі я буду прыходзіць з працы і сама змагу сачыць за дзіцем, то зручней будзе плаціць па гадзінах, вядома ж.

### КАХАННЕ ЗА ГРОШЫ НЕ КУПІШ?

**Сяргей:** Ну ты такая сучасная, мне аж балюча слухаць цябе. Ты яшчэ скажы што паслугамі сурагатнага мацярынства пагодзішся скарыстацца.

**Лізавета:** І скарысталася б, калі б былі такія грошы. Столькі ўсяго страшнага з жанчынай можа адбыцца пры родах... Але пакуль у мяне няма лішніх 50—100 тысяч долараў, так што быць майму хлопцу «дэкрэтнай мамай».

**Сяргей:** Ты так лёгка на гэтую тэму гутарыш. Можа, і сама б пагадзілася нарадзіць і аддаць гэтае дзіця чужым людзям.

**Лізавета:** У нашай краіне на гэтым вялікіх грошай не зробіш. Гарантаваная выплата — 13 000 долараў, а ўсё астатняе — па пагадненні бакоў (на прадукты, на аплату жылля, вітаміны, лекі і г. д.). І наогул, каб стаць сурагатнай маці, трэба мець хоць бы аднаго або некалькіх сваіх здаровых дзяцей, а паколькі дзяцей у мяне цяпер няма і ў найбліжэйшы час не прадбачацца, то зразумела, што сурагатнай маці мне не стаць.

**Сяргей:** Так, Ліза, так. Дзяцей лепш па старому «рабіць» — нараджаць. А хто з вас яго даглядаць будзе, самастойна вырашыце.

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Лізавета ТАНАНА.**
**Фота Маргарыты ПАЛЮХОВІЧ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 35 (561)

# ТАШКЕНЦКАЯ КІНАВОСЕНЬ

## Уражанні ад фестывалю, які адрадзіўся праз чвэрць стагоддзя

**XIII Ташкенцкі міжнародны кінафестываль «Жамчужына Шаўковага шляху», які на мінулым тыдні прайшоў у сталіцы і ў розных рэгіёнах Узбекістана, можна назваць пачаткам працягу. Калісьці Ташкенцкі кінафестываль краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі грымеў на ўвесь Савецкі Саюз і лічыўся значнай падзеяй у сусветным кіно. Дый само ўзбекскае кіно было на ўзроўні — нашы мамы і бабулі былі закаханыя ў прыгожых усходніх акцёраў (варта згадаць аднаго толькі Рустама Сагдулаева ў ролі лётчыка Рамэа з культавай ваеннай драмы), «Прыгоды Насрэдзіна» была адной з самых любімых кінаказак. Фактычна менавіта на ўзбекскай зямлі быў пакладзены пачатак кінематографа Сярэдняй Азіі, тут жа ў Самаркандзе з'явіўся першы ў рэгіёне кінатэатр «Зорка Усходу» (дарэчы, ён існуе і сёння, і ў ім падчас фестывалю праходзілі Дні беларускага кіно, але пра гэта крыху ніжэй).**

**Пасля развалу СССР кіно Узбекістана, як і ў многіх іншых рэспубліках, аказалася ў заняпадзе. Маштабных кінафорумаў на прасторы былога Саюза ўвогуле стала няшмат. Да гонару беларусаў наш «Лістапад», які не толькі з'явіўся ў той неспакойны час, але і здолеў зацвердзіцца на кінапрасторы, – адзін з гэтай нешматлікай кагорты. А вось у Ташкенце спатрэбілася амаль чвэрць стагоддзя, каб загаварыць аб адраджэнні.**




На самым старым у Сярэдняй Азіі самаркандскім кінатэатры — афішы беларускіх фільмаў.

### Плюс зоркі сусветнага кіно

Сёняшняе кіраўніцтва краіны, якое ўзяло курс на прагрэс ва ўсіх сферах (аб гэтым сведчыць і нядаўні візіт прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева ў Беларусь, падчас якога абмяркоўвалася супрацоўніцтва нашых краін у галіне высокіх тэхналогій), вялікую ўвагу ўдзяляе і культуры. Аднаўленне фестывалю кіно — асабістая ініцыятыва ўзбекскага прэзідэнта. Вялікую падтрымку атрымаў апошнім часам і «Узбекфільм». Акурат да фестывалю студыя атрымала абсталяванне на 28 мільёнаў долараў. Адкрыўся таксама новы будынак для кінафонду. Падчас фестывалю ў Ташкенце адкрыўся філіял расійскага ВГІКА, дзе будуць рыхтавацца акцёрскія і рэжысёрскія кадры для нацыянальнага кінематографа.

Несумненна, падобнае мерапрыемства прыцягвае да сябе ўвагу прысутнасцю вядомых асоб. У Ташкент прыехалі Мікіта Міхалкоў (які, дарэчы, згадаў, што быў на першым фестывалі ў далёкім ужо 1968 годзе), Цімур Бекмамбетаў, Люк Бесон, Жэрар Дэпардзье, Стывен Сігал і нават Філіп Кіркораў. Да кіно апошні мае адносіны вельмі невялікія — хіба што ролю Святога Валянціна ў камедыі «Каханне з першага погляду» сыграў, але спяваў на цырымоніі адкрыцця шчыра і сарваў заслужаныя апладысменты. Як і наша Алёна Ланская — яе песня «Куточак Беларусі» і кліп, паказаны на вялікім экране, выклікалі ў гледачоў толькі станоўчых эмоцый, а ў беларусаў — дык і слёзы на вачах. Бо гэта ж кранальна і ганарова — калі прыгажосць тваёй зямлі за тысячы кіламетраў бачаць сотні людзей з усяго свету і слухаюць песню на тваёй мове.

Арганізатары пастараліся, каб падкрэсліць грандыёзнасць падзеі. Падсвечаны ў нацыянальных колерах галоўны праспект, чырвоная дарожка, прамая трансляцыя, вялізная зала новага Дома кіно, прывітанне прэзідэнта краіны, зачытанае са сцэны. Удзельнікі з розных кантынентаў, прычым такія магутныя кінаіндустрыі, як Расія, ЗША, Індыя, — усё зроблена для таго, каб фэст апраўдаў сваю назву «Жамчужына Шаўковага шляху». Дадайце да гэтага цёплае надвор'е, у той час калі ў многіх краінах ужо халодная восень, і ўзбекскую гасціннасць і шчырасць — і можна ўпэўнена сказаць, што Ташкент у хуткім часе стане прыцягальным для аматараў кіно горадам, тым больш па рашэнні кіраўніка краіны фестываль мае стаць штогадовым...



Кадр з фільма «Франка». Актрыса Марына ПАДДУБНАЯ атрымала на фестывалі прыз за найлепшую жаночую ролю, а пастаноўшчык Мітрый СЯМЁНАЎ-АЛЕЙНІКАЎ — за найлепшую рэжысёрскую работу.

### Пранціш Вырвіч гаворыць па-ўзбекску

Гэта пра сам фестываль. Што датычыцца беларускага ўдзелу ў ім. Падчас прэс-канферэнцыі перад адкрыццём фестывалю гендырэктар Агенцтва па кінематаграфіі Узбекістана Фрыдаус Абдухалікаў сярод прыярытэтных праектаў назваў супрацоўніцтва з «Беларусьфільмам». Кіраўнік нашай нацыянальнай кінастудыі Уладзімір Карачэўскі перад камандзіроўкай у Ташкент дзяліўся спадзяваннямі на выгадныя праекты. У прынцыпе можна сказаць, што спадзяванні спраўдзіліся. Гэтаксама, як і тое, што Дні беларускага кіно — а яны, акрамя як у Ташкенце, праходзілі ў Самаркандзе і ў цэнтры Сырдар'інскай вобласці Гулістане — удаліся, прынамсі, прайшлі пры поўных залах. Беларускі «кінадэсант» усюды сустракалі вельмі цёпла і з непадробнай радасцю. Тлумачыць такую цікавасць да работ нашых кінематаграфістаў можна па-рознаму. Трэба найперш аддаць належнае кампаніі «Узбектэлекам», пры садзейнічанні якой Дні беларускага кіно праводзіліся. Але сыграла, думаецца, яшчэ і тое, што мерапрыемствы такога маштабу нячастыя, асабліва ў рэгіёнах, дзе жыхары не вельмі спешчаныя падобнымі відовішчамі і ідуць на іх як на свята. Як бы там ні было, залы сапраўды былі поўныя і віталі беларускіх кіношнікаў шчыра і радасна. У Гулістане на дні нашага кіно прыйшлі нават мясцовыя аксакалы, некаторыя з залатымі Зоркамі Героя на пінжаках. Трэба думаць, ваенная драма Дзмітрыя Астрахана «Лёс дыверсанта», якую прадстаўляў сам аўтар і з якой пачынаўся паказ, прыйшлася ім даспадобы.

Калі тэма вайны ўсім блізкая і зразумелая, дык гістарычна-прыгодніцкая стужка «Авантуры Пранціша Вырвіча» (знятая па кнізе Людмілы Рублеўскай, што пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда»), ды яшчэ агучаная па-ўзбекску, для ўсходняга гледача свайго роду экзотыка. Хоць акцёр Канстанцін Міхаленка, які ў фільме выконвае ролю «шэрага кардынала» Багінскага, прататыпам якога стаў палітык Міхаіл Казімір Агінскі, з гэтым не згодны. «Ва ўсе часы ва ўсіх народаў былі каханне і нянавісць, вернасць і здрада, прага да прыгод і любоў да Радзімы. Фільм пра гэта, таму, думаю, ён будзе зразумелы. А тое, што праз прыгодніцкі сюжэт глядач даведаецца пра нашу гісторыю, няхай сабе і міфалагізаваную, — гэта выдатна. Цікавіліся ж мы гісторыяй Францыі праз «Трох мушкецёраў»...

Што датычыцца конкурснай праграмы фестывалю. Яна была «заточаная» пад маладых удзельнікаў, і нашу краіну прадстаўляў малады рэжысёр Мітрый Сямёнаў-Алейнікаў. Яго работа «Франка», частка кінаальманаха «Вайна. Застацца чалавекам», названая па імені гераіні, якая, помсцячы за загубленых фашыстамі дзяцей, ледзь не забівае нямецкага параненага салдата, але знаходзіць у сабе чалавечнасць не рабіць гэтага, не засталася незаўважанай. Мітрый атрымаў прыз за найлепшую рэжысёрскую работу, а выканаўца галоўнай ролі Марына Паддубная — за найлепшую жаночую ролю. Так, ізноў «Беларусьфільм», ізноў вайна. Але пераможцы атрымалі ўзнагароды з рук славутага Люка Бесона, а гэта нечага варта.

Удзельнічаў наш малады рэжысёр і ў надзвычай цікавым праекце ў рамках фестывалю — «Кіно за пяць дзён». Камандам з 22 краін былі дадзены здымачнае абсталяванне, транспарт, магчымасць выбіраць акцёраў і... адзін з рэгіёнаў Узбекістана. За пяць дзён яны павінны былі зняць мастацкую кароткаметражку на тэму Вялікага Шаўковага шляху (увогуле гэта тэма ва Узбекістане цяпер актыўна выкарыстоўваецца, і небеспадстаўна: Самарканд на гэтым самым шляху заўсёды быў адным з ключавых пунктаў). Мітрыю Сяменаву-Алейнікаву дасталася Кашдар'інская вобласць — месца размяшчэння адной з самых высакагорных абсерваторый. Канешне, тэма зор загучала нават у назве фільма — «Зоры пачакаюць». Паводле сюжэта, маладая пара з Беларусі, астраном і яго сяброўка, едуць у гэту абсерваторыю. Па дарозе ў іх ламаецца машына, і яны мімволі аказваюцца паглыбленыя ў мясцовае жыццё... Хоць фільм і не ўзяў узнагарод (галоўны прыз забралі ўзбекскія кінематаграфісты), але гэта быў цікавы досвед.



Дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ (справа) і генеральны дырэктар Агенцтва па кінематаграфіі Узбекістана Фрыдаус АБДУХАЛІКАЎ у рамках фестывалю падпісалі важныя дакументы аб супрацоўніцтве.

У Хіве на днях дакументальнага кіно ад «Беларусьфільма» Галіна Адамовіч прадстаўляла фільм «Вяда» — пра Веніяміна Бычкоўскага, ураджэнца Расіі, які шмат падарожнічаў, але месцам жыхарства абраў глыбінку на беларускім Палессі...

### «Казбек» вяртаецца на Беларусь

Несумненна, на падобныя кінафорумы прадстаўнікі кінаіндустрыі едуць не толькі сябе паказаць ды на іншых паглядзець, але і вырашаць пытанні супрацоўніцтва. Для «Беларусьфільма» паездка ў Ташкент сталася плённай. У заключны дзень фестывалю «Беларусьфільм» і Агенцтва па кінематаграфіі Узбекістана падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве і Пагадненне аб намеры рэалізаваць сумесны праект — поўнаметражную мастацкую стужку з рабочай назвай «Казбек».

Сумесны праект «Казбек» — фільм пра Героя Савецкага Саюза Мамандалі Тапівалдзіева, легендарнага Казбека, ён партызаніў у беларускіх лясах і наводзіў жах на фашыстаў, якія за яго галаву абяцалі вялікую ўзнагароду. Да нядаўняга часу імя гэтага чалавека было забытае і ва Узбекістане, і ў Беларусі, хаця ў 60—70-я гады, калі ён жыў на Радзіме і быў ужо праслаўленым бавоўнаробам, пра яго здымалі фільмы, пісалі артыкулы. Канец забыццю паклала Святлана Дудзюк, старшыня Беларускага культурнага цэнтра «Світанак» у Ташкенце. Святлана Мікалаеўна расказвае, што, шукаючы агульнае ў гісторыі двух народаў, знайшла старыя публікацыі пра ўзбекскага героя. Пацікавілася, ці засталіся яго сваякі, паехала туды, дзе ён жыў, сустрэлася з дзецьмі і ўнукамі, якія захоўваюць памяць пра славутага продка. Гэтай сустрэчай зацікавіліся ўзбекскія журналісты — і тэма раскруцілася аж да кінапраекта.

Рэжысёр фільма Мухамад Алі Іскандараў ужо прыязджаў у Беларусь, знаёміўся з пляцоўкамі для здымак — 90 працэнтаў сцэн будзе знята ў нашай краіне. Ён вельмі ўражаны маштабам бяды, якая здарылася на акупаванай тэрыторыі Беларусі падчас вайны, і маштабам народнага супраціўлення фашысцкай навале, і натхнёны працаваць над праектам, у якім будуць задзейнічаны і беларускія спецыялісты.

Зноў «Беларусьфільм» і ваенная тэма? А хто сказаў, што гэта дрэнна? Асабліва калі яшчэ і выгадна?

Дарэчы, нядаўна на беларускай пляцоўцы здымаліся эпізоды яшчэ аднаго ўзбекскага фільма — «Вясна кахання». Хоць падзеі ў ім адбываюцца не ў Беларусі, а на фронце дзесьці між Расіяй і Украінай, здымаць гэтыя еўрапейскія сцэны рэжысёр Ібрахім Расулаў вырашыў менавіта ў нас. Чаму? Не толькі таму, што ў нас добрыя ўмовы для работы, прызнаецца ён. Фільм пра паэта Хаміда Алімджана і яго жонку Зульфію — тых самых узбекскіх паэтаў, у якіх знайшоў прытулак падчас эвакуацыі ў Ташкент наш Якуб Колас...

***

Карацей, у Ташкенце беларусам было на што паглядзець, было што паказаць. Магчыма, нават было чаму павучыцца. Ці скарыстаем штосьці з іхняга досведу? Пабачым: «Лістапад» ужо вельмі хутка.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# У ЛАБІРЫНТАХ МАСТАЦТВА

## Сюррэалістычныя фантазіі Георгія Скрыпнічэнкі

**За Георгіем СКРЫПНІЧЭНКАМ замацавалася слава першага беларускага сюррэаліста ў беларускім мастацтве XX стагоддзя. Гэта распаўсюджанае меркаванне аспрэчваюць родныя і сябры мастака, сцвярджаючы, што яго творчасць была living разнабаковай: гэта і віртуозная графіка, і пейзажны жывапіс настрою, і выдатныя, яшчэ да канца не ацэненыя пейзажы Мінска. Але вядомым Скрыпнічэнка стаў дзякуючы сваім парадаксальным змрочным сюррэалістычным карцінам. Іх можна пабачыць на выстаўцы «Сюррэалістычныя фантазіі», якая нядаўна адкрылася ў Смілавічах.**

Скрыпнічэнка не быў падобны да іншых ужо з дзяцінства. Ураджэнец украінскага Мікалаева, ён пераехаў у Слуцк 7-гадовым хлапчуком у 1947 годзе і, захоплены маляваннем, амаль адразу паступіў у студыю да мясцовага мастака Садзіна, вучня Уладзіміра Фаворскага. Уладзімір Садзін быў для Слуцка тым жа, што Сяргей Каткоў для Мінска — настаўнікам цэлай плеяды слуцкіх мастакоў. Там, у студыі, Георгій з галавой акунуўся ў свет мастацтва. Настолькі глыбока, што закінуў вучобу, стаў другагоднікам у 9 класе, пайшоў у вячэрнюю школу. Ужо тады не баяўся вылучацца: быў першым і адзіным у Слуцку стылягам: «дзяўчынкі аж вішчалі ад захаплення», калі ён з'яўляўся на вуліцах Слуцка.

У выбаўчых мэтах бацька ўладкаваў яго працаваць рабочым у Салігорску, затым — на аўтабазу. У Мінскае мастацкае вучылішча паступіў з другога разу. Пашанцавала: вучыўся ў выдатных педагогаў, Малішэўскага і ў маладога Шчамялёва. Выязджаў у студэнцкія гады на знакамітую Манежную «бульдозерную» выстаўку 1962 года. У Маскве купляў кнігі па мастацтве, тады ж у яго рукі трапіў і альбом Далі, які вызначыў творчы лёс. Дыпломным праектам стала мазаіка для Мінскага завода будаўнічых дэталяў. Атрымалася цікава, але не разлічыў па маладосці гадоў яе памер, і яе немагчыма было вынесці з майстэрні — прыйшлося разбіць адбойным малатком.

Яго настаўнік Леанід Шчамялёў пасля заканчэння вучылішча павёў некалькі таленавітых студэнтаў паступаць у Ленінград, у Інстытут імя Рэпіна — былую Акадэмію мастацтваў. Ніхто са студэнтаў Шчамялёва не паступіў — занадта ўсе яны былі своеасаблівыя. А ў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут сам Скрыпнічэнка паступаць не захацеў. А дакладней, адчуваў, што яго не прымуць. І на такое меркаванне ў яго былі прычыны. «У 1965-м, — успамінаў ён, — амаль скончыўшы вучылішча, я выстаўляўся ў рамках Усесаюзнай маладзёжнай выстаўкі ў нашым Мастацкім музеі. Гэта быў нацюрморт з прасам і аўтапартрэт з лімонам. Пасля выстаўкі мяне за гэтыя нявінныя, як на сённяшні розум, работы назвалі «хуньвэйбінам у мастацтве» і ледзь не выгналі з вучылішча за фармалізм».

Пасля заканчэння Мінскага мастацкага вучылішча працаваў дызайнерам. Яго тры разы не прымалі ў Саюз мастакоў БССР, а калегі-мастакі ў вочы казалі: «А ты, Жора, усё сваіх крэціначкаў малюеш?» Для рэалістаў, якія ў тыя гады ўваходзілі ў праўленне Саюза мастакоў БССР, асоба Скрыпнічэнкі была, вядома, адыёзнай і несур'ёзнай. Але сам Георгій ніколі не камплексаваў ні з-за сваёй сярэдняй мастацкай адукацыі, ні з-за абранага шляху ў мастацтве. Ён здолеў захаваць уласны свет, а майстэрства напрацоўваў у майстэрні доўгімі днямі і вечарамі.

Неўзабаве пасля з'яўлення на рэспубліканскіх выстаўках серыі яго графічных аркушаў, прысвечаных Коласу і Купалу, старэйшае пакаленне прызнала ў ім майстра, здольнага не толькі маляваць «монстраў». Многія ўвогуле лічаць, што яго графіка куды больш пераканаўчая, чым жывапіс. Яго прынялі ў Саюз мастакоў у 1972 годзе ў секцыю графікі.

Скрыпнічэнка па маладосці, як успамінаюць яго сябры, быў сапраўдным прадстаўніком мінскай багемы, «шмат куралесіў» і быў вялікім франтам, любіў вытанчана апранацца, хадзіў з парасонам або кіем. «З ім немагчыма было ісці па горадзе — яго ўсе ведалі, віталі», — скардзілася і ганарылася жонка... Каб схадзіць па хлеб у краму, выбіраў гальштук-матылёк і пінжак. Тады ж завёў вусы як у Далі, хоць да гэтага, мяркуючы па фатаграфіях, меў модныя вусы ў стылі Мулявіна.

Але гэта вонкавае. Кожны дзень Георгія Скрыпнічэнкі пачынаўся ў майстэрні. Сын Сяргей лічыў, што бацька жыў сваімі работамі і практычна больш нічым.

### «Калі не будзе закаханасці, навошта мне жывапіс?»

Сямейныя адносіны яго таксама мала хвалявалі, — сцвярджае сын. Аднак усе тры яго жонкі — усе, дарэчы, былі звязаны з мастацтвам — пазнавалі сябе ў яго карцінах. Ён цягнуўся да прыгажосці і існаваў у стане трывалай закаханасці....

Творчасць Скрыпнічэнкі можна падзяліць на перыяд вучнёўскі, абавязковы для ўсіх, рэалістычны, рамантычны і, нарэшце, сюррэалістычны. У 1990-я — перыяд рэвалюцый ў беларускім мастацтве, калі ішоў пошук сучаснай стылістыкі, ён паспрабаваў злучыць усе грані сваёй творчасці ў адзінае цэлае, стварыць так званы нацыянальны варыянт рамантычнага сюррэалізму. Вельмі любіў замест класічнага палатна выкарыстоўваць ДВП або фанеру, пісаў карціны, здаецца, на ўсім, на чым можна. І вельмі не любіў іх прадаваць, бо мог вяртацца да твораў праз гады і таму часта пісаў копіі з іх перад продажам.

### «Я пішу не карціны, а свае фантазіі»

Так часам казаў ён. Карціны яго адначасова простыя і складаныя. Сам аўтар ніколі не тлумачыў, не расшыфроўваў іх, аддаючы гэта права гледачу і крытыкам-мастацтвазнаўцам. Імправізаваў з палатном, ствараючы новыя фактуры, уводзячы ў іх элементы калажа, гуляючы з паверхнямі, са сваімі мроямі. У яго карцінах ёсць нейкі хвараваты нерв, які вярэдзіць душу гледача. На яго палотнах часта намаляваны мінулае, будучыня і сучаснасць. Старадаўні партрэт можа суседнічаць з дзяўчынкай у сучасных басаножках, эпізод з мінулага ствараe карціну ў карціне. Зачароўваюць загадкавыя нацюрморты з зіхоткім яйкам у цэмры — першаасновай жыцця. Пры гэтым крыніцай натхнення заўсёды служаць бытавыя пазнавальныя прадметы і сучаснікі — знаёмыя, суседзі, блізкія людзі. Скрыпнічэнка стварыў свой свет з персанажамі — Адамам і Евай, закаханымі парамі, загадкавымі кінакефаламі — мужчынамі з сабачымі галовамі, падгледжанымі на абразах, таямнічымі змрочнымі краявідамі з улюбёнкай, белай кошкай Маркізай, адчыненым акном, на якім адрэзаная галава (гіпсавая мадэль у плоці?) пазірае на навакольны пейзаж са здзіўленнем.

Паступова з поспехам выставак прыходзіла прызнанне. Стыль Скрыпнічэнкі быў пазнавальны з першага погляду. Карціны ўслед за калекцыянерамі прызналі і сталі купляць музеі, у Нацыянальным мастацкім яны складаюць цэлую калекцыю — 11 карцін, каля 20 графічных лістоў. Гэта толькі падштурхоўвала яго да творчасці, а ў 60 гадоў — да пустэльніцтва, эканоміі часу. Кудысьці знікла яго эпатажнасць і імкненне вылучыцца з натоўпу. Сын цяпер прасіў яго апранацца лепш, але ён цалкам сышоў у мастацтва. Пры сустрэчы з сябрамі мог устаць і сысці, калі трэба было нешта дарабіць у майстэрні. «Я павінен паспець», — пачаў гаварыць ён за тры гады да свайго сыходу. Цяпер яго спадчына велізарная, больш за тысячу карцін, захоўваецца ў нашчадкаў і калекцыянераў. Толькі частка ўвайшла ў двухтомнік-альбом, які мастак падрыхтаваў да свайго 75-гадовага юбілею.



Апошнія некалькі гадоў аддаваў перавагу свайму дому ў Белым Беразе каля Налібоцкай пушчы, дзе пабудаваў майстэрню. Пісаў штодня ў адзіноце. «Наша шчаслівае трыа», — казаў ён жонцы. Трэцяй была кошка Маркіза — белы перс, якая намаляваная на некалькіх творах, да якой адчуваў хваравітую прыхільнасць... «Гэта падарунак лёсу. Яна змяніла ўвесь мой лад жыцця. Ні адна жанчына не можа выклікаць у мяне такога пачуцця любові, адданасці і прагі жыцця». На яе лячэнне не патраціў тысячу долараў і аплакваў як блізкага чалавека...

Мастак раптоўна сышоў у 2015 годзе, поўны творчых задум. Прах яго (у духу сюррэалізму) пахаваны ў двух любімых ім месцах — у Мінску і Белым Беразе. Але душа яго засталася жыць у карцінах, якія з гадамі набываюць новыя сэнсы.

**Надзея УСАВА, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

---

На сцэне

# ТЭАТР, ЯКІ НЕ БАІЦЦА ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ

## У РТБД ідзе спектакль «Калека з вострава Інішман»

**Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі — адзін з самых моцных мінскіх тэатраў. Гэта і разнастайнасць спектакляў, зробленых па п'есах сучасных драматургаў, гэта і адмысловая ігра акцёраў. А таксама адсутнасць страху перад эксперыментамі. Тэатру беларускай драматургіі ўдаецца не ўпасці ў лубачныя, нізкапробныя спектаклі-аднадзёнкі. Вось і зноў на сцэне ідзе новая пастаноўка — «Калека з вострава Інішман». Якую сувязь маленькая вёска ў Ірландыі мае з беларускай літаратурай? І на якой мове трэба размаўляць з гледачом, каб ён цябе пачуў?**



Каб лепш зразумець кантэкст «Калекі з вострава Інішман», трэба ведаць тое-сёе пра аўтара. Марцін МакДонах — сучасны драматург ірландска-англійскага паходжання. Ён не адносіць сябе да канкрэтнай нацыянальнасці. Гэта важны факт для ўспрымання яго п'ес: у аўтара няма мэты высмеяць ірландцаў, роўна як няма жадання абразіць англічан. «Калека з вострава Інішман» уваходзіць у «трылогію Аранскіх астравоў». Першы паказ спектакля адбыўся ў 1996 годзе і паспяхова ідзе па сённяшні дзень у розных тэатрах свету.

